16+

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 47 (5256) 24 лістапада 2023 г. ISSN 0024-4686

Поспех — агульнымі намаганнямі стар. 4—5

Вопыт паважаных старшынь стар. 12

Які ён, найлепшы спектакль? стар. 14

Свята кінагурманаў

Фота БелТА.

Адлюстраванне актуальных працэсаў у кіно, развіццё міжнародных культурных сувязей, захаванне традыцый і кінематаграфічнай спадчыны, падтрымка маладых талентаў, дэманстрацыя найлепшых дасягненняў экраннага мастацтва — усё гэта Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад», які праходзіць сёлета пад слоганам «Ствараем будучыню» і на працягу тыдня радуе айчынных гледачоў.

Сваю гісторыю «Лістапад» вядзе з 1994 года. Першапачаткова ён задумваўся як кінафорум краін СНД і Балтыі, закліканы аб'ядноўваць найлепшыя карціны, створаныя на постсавецкай прасторы. З часам кінафестываль набываў папулярнасць і заваёўваў аўтарытэт, а ў 2003 годзе афіцыйна набыў статус міжнароднага. Сёння ён з'яўляецца адным з найбуйнейшых еўрапейскіх форумаў кіно, які збірае і паказвае найлепшыя сусветныя прэм'еры. Усе гэтыя гады фестываль праходзіць пад патранажам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, ад яго імя ўручаюцца спецыяльныя прызы «За захаванне і развіццё традыцый духоўнасці ў кінамастацтве» і «За гуманізм і духоўнасць у кіно».

У гэтым годзе на фестываль пададзена рэкордная колькасць заявак (2087) са 107 краін Еўропы, Азіі, Лацінскай Амерыкі і Афрыкі. Больш за ўсё — з Ірана, Індыі, Расійскай Федэрацыі, Бразіліі і Кітая. Заяўкі прымаліся па пяці намінацыях: конкурс фільмаў «Кіно маладых», конкурс анімацыйных фільмаў, конкурсы ігравога і неігравога кіно і конкурс фільмаў для дзіцячай і юнацкай аўдыторыі «Лістападзік». Паказы праходзяць больш як у 80 кінатэатрах па ўсёй краіне. У склад журы XXIX Мінскага міжнароднага кінафестывалю ўваходзяць вядомыя дзеячы і вядучыя эксперты ў сферы кіно, старшыня — савецкі і расійскі акцёр, кінарэжысёр, сцэнарыст, прадзюсар, тэлевядучы Ігар Угольнікаў.

У межах пазаконкурснай праграмы прайшлі Дні казахскага, расійскага, пакістанскага і сірыйскага кіно, у Акадэміі мастацтваў адбыўся дзень адкрытых дзвярэй, а аматары савецкага кіно мелі магчымасць убачыць любімыя фільмы на экранах кінатэатраў.

Урачыстая цырымонія закрыцця адбудзецца сёння ў Доме кіно.

«ЛіМ»-акцэнты

Віншаванне. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла з днём нараджэння. «Усё сваё жыццё вы самааддана служыце Богу, людзям і сваёй краіне. На вас як на прадстаяцеля Рускай праваслаўнай царквы час усклаў асаблівую адказнасць. Увесь свет праходзіць нялёгкія выпрабаванні, і мільёны вернікаў маюць вострую патрэбу ў мудрым слове, малітоўнай і бацькоўскай дапамозе свайго Патрыярха, каб умацаваць веру і не збіцца з сапраўднага шляху», — гаворыцца ў віншаванні. Кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць у тым, што праваслаўе і агульныя маральныя каштоўнасці, на варце якіх цвёрда стаіць Маскоўскі патрыярхат, і ў далейшым будуць аб'ядноўваць народы Беларусі і Расіі.

• Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народнага артыста Расіі Аляксандра Малініна з 65-годдзем. «Яскравы талент, індывідуальнасць і непаўторнае вакальнае майстэрства прынеслі вам шырокую вядомасць і велізарную любоў гледачоў», — гаворыцца ў віншаванні. Праніклівае выкананне Аляксандрам Малініным рамансаў, песень савецкіх і расійскіх аўтараў пакарыла сэрцы мільёнаў паклоннікаў, адзначыў беларускі лідар. «Упэўнены, што ваша творчасць і ў далейшым будзе дарыць публіцы радасць і добры настрой, садзейнічаць актыўнаму культурнаму дыялогу паміж народамі Беларусі і Расіі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Пашана. Спецыяльны прыз Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За захаванне і развіццё традыцый духоўнасці ў кінамастацтве» на XXIX Мінскім міжнародным кінафестывалі «Лістапад» быў прысуджаны беларускаму кінарэжысёру, мастацкаму кіраўніку Тэатра-студыі кінаакцёра, народнаму артысту Беларусі Аляксандру Яфрэмаву. «Я надзвычай удзячны за прысваенне гэтага прыза мне. Гэта вялікі гонар і вялікая адказнасць, якую я ўсведамляю», — сказаў Аляксандр Яфрэмаў. Ён дадаў, што Кіраўнік дзяржавы заўсёды ўдзяляў фестывалю вялікую ўвагу. «Гэта ганарова і да многага абавязвае», — падкрэсліў рэжысёр.

Конкурс. У Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры падвялі вынікі конкурсу чытальнікаў «Белая птушка», прысвечанага 140-годдзю Янкі Маўра і 95-годдзю аповесці пісьменніка «Сын вады», перадае БелТА. Пераможцы атрымалі дыпломы і прызы, а таксама магчымасць выступіць на радыё. Найлепшыя запісы прагучаць у эфіры канала «Культура». Для праграмы «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя» будзе падрыхтаваны радыёсерыял «Сын вады» па матывах аповесці Янкі Маўра. Па выніках конкурсу ўдзел у стварэнні радыёсерыяла «Сын вады» прымуць 45 дзяцей і дарослых з ліку канкурсантаў. Удзельнікам творчага спаборніцтва неабходна было самастойна агучыць фрагменты твора Янкі Маўра. У арганізацыйны камітэт конкурсу паступіла больш за 120 заявак з розных гарадоў Беларусі. Удзел у спаборніцтве прынялі не толькі школьнікі, але і педагогі, прафесійныя акцёры, прадстаўнікі розных спецыяльнасцей.

Вернісаж. Выстаўка «Думкі ўслых» Наталлі Піскуновіч адкрылася ў музеі «Дом Ваньковічаў. Культура і мастацтва першай паловы XIX стагоддзя». Экспазіцыя прымеркавана да юбілею мастачкі. Прадстаўлена каля 30 тэматычных акварэльных работ, створаных за апошнія 10 гадоў. «Мастак павінен мець магчымасць выказаць свае думкі. І гэтая магчымасць — яго работы. А выстаўка сёння — мой шанц падзяліцца сваімі думкамі», — расказала пра ідэю праекта мастачка. Асноўнае месца на выстаўцы займаюць работы, прысвечаныя малой радзіме мастачкі — Віцебшчыне. Асобную серыю работ Наталля Піскуновіч прысвяціла падарожжу ў Рым. Выстаўка «Думкі ўслых» прадоўжыцца да 30 снежня.

Тэатр. Прэм'ера — спектакль «Белыя ночы» паводле аднайменнай аповесці Фёдара Дастаеўскага — запланавана 28 і 29 лістапада ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным тэатры юнага гледача. Рэжысёрам-пастаноўшчыкам выступае Эстэр Мітрафан. Мастак-пастаноўшчык — Ганна Іткіна. У якасці мастака па святле — Нанна Шэх. «Знаёмства ў піцерскай параднай, нястрымныя размовы, перапляценні гісторый і перажыванняў — усё за чатыры ночы. За чатыры ночы мар», — інтрыгуе анатацыя.

Праект. Нацыянальны мастацкі музей пачаў цыкл штотыднёвых лекцый пра французскае мастацтва. Ён прымеркаваны да адкрыцця выстаўкі «Нашы калекцыі. Французскае выяўленчае мастацтва». Першай тэмай лекцыі стала «Мастацтва Францыі XVII стагоддзя». У гэты час зарадзіўся класіцызм — стыль, які арыентуецца на каноны антычнага мастацтва. Пра перыяд і выдатных дзеячаў эпохі на лекцыі расказала вядучы навуковы супрацоўнік Алена Шапашнікава, якая працуе ў музеі больш за 40 гадоў.

Агляд афіцыйных падзей ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

стасункі

Туркменскі празаік вызваляў Віцебшчыну

Газета «Нейтральный Туркменистан», заснавальнікам якой з'яўляецца Кабінет Міністраў Туркменістана, надрукавала артыкул старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі. Алесь Карлюкевіч у знак набліжэння 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў расказвае пра ваеннага карэспандэнта, туркменскага пісьменніка-франтавіка Ашыра Назарава, з якім быў асабіста знаёмы.

Туркменскі літаратар удзельнічаў у вызваленні Віцебшчыны, свае франтавыя ўражанні ад сустрэчы, знаёмства з Беларуссю занатаваў у шэрагу апавяданняў і нарысаў. Ашыр Назараў у пасляваенныя гады служыў у газеце Туркестанскай ваеннай акругі «Фрунзевец», з якой, дарэчы, звязаны і лёс народнага паэта Беларусі Якуба Коласа як аўтара многіх публікацый у гады Вялікай Айчыннай. Напрыканцы 1950-х гг., зволіўшыся з вайсковай службы, падпалкоўнік А. Назараў вярнуўся ў Туркменістан. «Мне давялося часта сустракацца з Ашырам Назаравым у 1980-я гады, — згадвае Алесь Карлюкевіч. — Выключна чулы, разумны чалавек, цікавы пісьменнік, творы якога выдаваліся не толькі па-туркменску, але і перакладаліся і выдаваліся на рускай і беларускай мовах. Добра ведаў беларускую літаратуру, шанаваў творчасць пісьменнікаў-франтавікоў Івана Шамякіна, Васіля Быкава. У сярэдзіне 1980-х Ашыр Назараў працаваў у Саюзе пісьменнікаў Туркменскай ССР… Пра пісьменніка-франтавіка я не аднойчы пісаў у беларускім і туркменскім перыядычным друку, у сваіх кнігах пра беларуска-туркменскія літаратурныя сувязі. Ведаю, што ў Туркменістане і цяпер з павагай ставяцца да творчасці свайго папярэдніка, да памяці пра ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны Ашыра Назарава. Вось з'явілася і новая публікацыя ў газеце "Нейтральный Туркменистан"… А ў Марах, на радзіме пісьменніка, у яго роднай школе створаны музей імя Ашыра Назарава».

Сяргей ШЫЧКО

Падарунак Кітаю

У Саюза пісьменнікаў Беларусі даўно склаліся добрыя адносіны з Другім Пекінскім універсітэтам замежных моў. Некалькі гадоў назад у бібліятэку Цэнтра культуры Беларусі, які працуе ў кітайскай ВНУ, з дапамогай Пасольства Рэспублікі Беларусь у Кітайскай Народнай Рэспубліцы была перададзена падборка кніг з серыі «Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі» на беларускай і рускай мовах. За апошнія гады ў Пекінскім універсітэце сабралася бібліятэка кніг, выдадзеных у Мінску, колькасцю некалькі соцень экзэмпляраў.

І вось — новы падарунак ад беларускіх пісьменнікаў. Карыстаючыся тым, што ў Мінску працавала дэлегацыя выкладчыкаў і арганізатараў адукацыйнага працэсу з кітайскай ВНУ, Саюз пісьменнікаў Беларусі перадаў падборку кніг па беларускім краязнаўстве і літаратуразнаўстве, а таксама зборнікі твораў беларускіх празаікаў, якія пішуць па-беларуску і па-руску і выдадзены ў серыі «Сучасная беларуская літаратура». Назвы толькі некаторых кніг з серыі: «Душа твая светлая», «Чароўная скарбонка», «Цені дзікага палявання»…

Каментуючы падзею, прарэктар Другога Пекінскага ўніверсітэта замежных моў Чжан Янь заўважыў наступнае: «Гартаючы кнігі, я звярнуў увагу на тое, што беларусы ўважлівыя да паэзіі. Няўжо і моладзь ваша так апантана чытае класікаў?!. Але я разумею, што краіну, народ можна адлюстраваць напоўніцу праз сімвалічныя, добра вядомыя творы. І ў нацыянальнай паэзіі іх заўсёды шмат».

Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Карлюкевіч і прарэктар кітайскай ВНУ Чжан Янь дамовіліся, што ў найбліжэйшы час бібліятэку Цэнтра культуры Беларусі ў Другім Пекінскім універсітэце замежных моў папоўняць электронныя версіі кніг сучасных беларускіх пісьменнікаў.

Раман СЭРВАЧ
Фота Лізаветы ГОЛАД

да ведама

На мове гарадскога фэнтэзі

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылася сустрэча з дзіцячай пісьменніцай з Самары Вікторыяй Ледэрман, аўтаркай кніг для школьнікаў «Каляндар майя», «Да дошкі пойдзе Васількін», «Першакурсніца», «Тэорыя неверагоднасці» і іншых.

Пісьменніца, якая працуе ў жанры гарадскога фэнтэзі, падзялілася ўражаннямі свайго дзяцінства, юначымі захапленнямі. Вікторыя Ледэрман нарадзілася на Волзе, у 2001 годзе скончыла філалагічны факультэт Самарскага дзяржаўнага сацыяльна-педагагічнага ўніверсітэта і выкладала французскую і англійскую мову ў школе.

У 2014 годзе прыняла ўдзел у літаратурным конкурсе з аповесцю «Каляндар майя», атрымала Міжнародную дзіцячую прэмію імя У. П. Крапівіна, а пазней і прэмію імя Карнея Чукоўскага.

Літаратар супрацоўнічае з выдавецтвам «КомпасГід», дзе выходзяць яе кнігі. Адзін з яе твораў быў экранізаваны, здымкі праходзілі ў Санкт-Пецярбургу.

Сюжэты і героі яе аповесцей не выдуманыя, а ўзятыя з жыцця і школьных назіранняў, таму блізкія сучасным юным чытачам.

Эла ДЗВІНСКАЯ

навідавоку

Маленькая энцыклапедыя на кожны дзень

У выдавецтве «Беларусь» пабачыў свет адрыўны каляндар «Родны край» на 2024 год. Выпуск выдання ажыццёўлены па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Традыцыя выдання календара «Родны край» не адно дзесяцігоддзе. У выпуску на 2024 год, як пераконваюць чытача выдаўцы, «прапануецца адправіцца <…> у падарожжа па беларускім краі… Каляндар дапаможа вам прасачыць юбілейныя даты вядомых суайчыннікаў — юбіляраў 2024 года: вучоных, пісьменнікаў, акцёраў, мастакоў, архітэктараў, што жылі ў розныя часы і ўславілі наш край. Значнае месца ў выданні адведзена традыцыйным абрадам і звычаям. Не засталіся па-за ўвагай і прадстаўнікі флоры і фаўны з Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь… На старонках календара ёсць таксама рэцэпты прыгатавання страў нацыянальнай і сусветнай кухні… Каляндар — маленькая энцыклапедыя на кожны дзень».

Якія значныя гістарычныя, асветніцкія даты будуць адзначаць беларусы ў 2024-м?.. 105 гадоў з дня ўтварэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі — 2 студзеня. 95 гадоў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі — таксама 2 студзеня. А праз дзень, 3 студзеня, — у календары згадка пра тое, што сёлета спаўняецца 980 гадоў з пачатку будаўніцтва ў Полацку Сафійскага сабора. А яшчэ ж — 920 гадоў з дня нараджэння Ефрасінніі Полацкай, легендарнай беларускай асветніцы. 8 студзеня — 100 гадоў з дня нараджэння лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі пісьменніка Алеся Савіцкага (1924—2015). 13 студзеня — 125 гадоў з дня нараджэння Васіля Каржа, Героя Савецкага Саюза, аднаго з кіраўнікоў партызанскага руху ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. 17 студзеня — 120 гадоў з дня нараджэння класіка беларускай дзіцячай літаратуры Алеся Якімовіча (1904—1974). 30 студзеня — 80 гадоў з часу аднаўлення (1944) часопіса «Беларусь», які раней меў назву «Чырвоная Беларусь». 2 лютага — 75 гадоў з дня нараджэння Героя Беларусі Міхаіла Карчміта (1949—2004), які доўгі час паспяхова кіраваў аграрным прадпрыемствам «Сноў» Нясвіжскага раёна…

Каляндар «Родны край» выдадзены тыражом 4000 экзэмпляраў. І набыць яго можна ў кнігарнях ААТ «Белкніга» па ўсёй краіне, а таксама ў кнігарні «Акадэмкніга» ў Мінску па адрасе: праспект Незалежнасці, 72.

Сяргей ШЫЧКО

вектар

Тры сакрэты Міхала Клеафаса Агінскага

У наступным годзе музей-сядзіба Міхала Клеафаса Агінскага, што ў Залессі Смаргонскага раёна, адзначыць сваё дзесяцігоддзе. А ў 2025-м слыннаму гаспадару залескай сядзібы споўніцца 260 гадоў. Да гэтых гадавін супрацоўнікі музея рыхтуюцца загадзя. Нядаўні дыспут, які адбыўся ў так званых Паўночных Афінах, закранаў пытанні далейшага вывучэння і папулярызацыі спадчыны слыннага дыпламата, музыканта.

Былі запрошаны супрацоўнікі і прадстаўнікі амаль усіх рэгіянальных устаноў культуры, адукацыі і грамадскіх арганізацый, якія ўганараваны слаўным імем Агінскага. Кожны з выступоўцаў аргументаваў думку адносна складнікаў поспеху Міхала Клеафаса ў розных галінах дзейнасці: дыпламатыя, музыка, мемуарыстыка. Свой важкі ўнёсак аўтар слыннага паланэза «Развітанне з Радзімай» зрабіў у справу палітычнага, культурнага і эканамічнага развіцця нашага краю.

Навуковы супрацоўнік музея Васіль Грыбанаў прапанаваў сваё бачанне паспяховасці і жывучасці спадчыны наогул і музычных твораў маэстра ў прыватнасці. Мастацтвазнаўца Святлана Немагай у дасланых уласных высновах паспяховасці князя Агінскага назвала тры складнікі: бліскучая адукацыя, музычны талент і ўменне выстройваць стасункі з людзьмі. Большасць прысутных пагадзіліся, што аднаго факту нараджэння ў княскім родзе было б не дастаткова для таго, каб стаць уплывовай асобай у розных сферах. Асабістыя якасці гуманіста, высокаадукаванай асобы, моцнага духам чалавека Міхала Клеафаса вылучалі як дзеяча, які нашмат апярэдзіў свой час.

Напрыканцы сустрэчы дырэктар музея-сядзібы Людміла Градзіцкая падзялілася новымі знаходкамі навуковых супрацоўнікаў, расказала пра найбліжэйшыя планы па добраўпарадкаванні паркавай тэрыторыі, аднаўленні ліпавай алеі і іншых цікавых мерапрыемствах.

Ала СТРАШЫНСКАЯ

юбілей

Заслужанае ўшанаванне

У Быхаўскім раённым цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва работнікі цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Б. В. Стральцова арганізавалі літаратурную гасцёўню «Я памятаю ўсё», прысвечаную 90-годдзю пісьменніка-земляка Яўгена Соцікава. Быў запрошаны пісьменнік і журналіст, ганаровы грамадзянін Быхаўскага раёна Мікалай Леўчанка.

Кола інтарэсаў Яўгена Соцікава шырокае. Успаміны аб Вялікай Айчыннай вайне занатаваў у кнігах «Страшна ўспомніць» і «Вайна вачыма дзяцей». Пісаў пра лёсы вядомых гістарычных асоб. Працоўны шлях непарыўна звязаны з Магілёўскім металургічным заводам і таму асаблівае месца ў яго творчасці займае энергетыка. У апошнія гады, нягледзячы на пагаршэнне здароўя (Яўген Анатольевіч інвалід па зроку), выдаў дзве кнігі — «Энергетыка ад вогнішча да плазмы» (2020) і «Нікола Тэсла» (2021). Цяпер Яўген Анатольевіч жыве ў г. Магілёве.

Для творчасці Мікалая Леўчанкі тэма Вялікай Айчыннай вайны — ключавая. Мікалай Уладзіміравіч шмат пісаў пра быхаўчан, якія змагаліся на франтах, у партызанскіх атрадах. Пісьменнік расказаў прысутным, як збіраў матэрыял, чытаў вершы.

Мерапрыемства праходзіла ў межах бібліятэчнай праграмы «Пісьменнік. Бібліятэка. Чытач».

Алена СІДАРЭНКА

прэзентацыі

Далёкія місіянерскія падарожжы

Збор твораў свяціцеля Мікалая Японскага прадставілі ў Мінску і Жыровічах. Хутка — прэзентацыя і ў Астраўцы. Мікалай Японскі цесна звязаны з ураджэнцам гэтых мясцін Іосіфам Гашкевічам. Разам яны заклалі асновы праваслаўя ў Японіі.

У канцы кастрычніка фонд рэлігійнай літаратуры Астравецкай раённай бібліятэкі папоўніўся працамі Мікалая Японскага ў пяці тамах. Збор стаў падарункам для бібліятэкі і яе чытачоў. Ён уключае афіцыйную перапіску, дзённікавыя запісы і лісты святога, пропаведзі, навуковыя артыкулы, а таксама карты місіянерскіх падарожжаў і іншыя дакументы. Архіепіскап Уладзікаўказскі і Аланскі Герасім уручыў падарунак Наталлі Ачарэтавай, дырэктару раённай бібліятэкі. У мерапрыемстве прынялі ўдзел і члены навукова-рэдакцыйнага савета, якія наведалі Астравец.

Між іншым, сёлета спаўняецца 165 гадоў з пачатку рускай дыпламатычнай місіі ў Японіі. Адным з пунктаў маршруту стаў аграгарадок Малі, дзе прайшлі апошнія гады Іосіфа Гашкевіча. Менавіта таму госці наведалі філіял «Мальская

сельская бібліятэка» і пазнаёміліся з экспазіцыяй, прысвечанай жыццю і дзейнасці вучонага.

Вольга ЗАЯНЧКОЎСКАЯ, фота аўтара

на развітанне

Запальвала ідэямі

Ларыса Фінкельштэйн у нейкім сэнсе была сімвалам беларускага мастацкага асяроддзя. На выстаўках ёй заўсёды было што сказаць як мастацтвазнаўцы. Як куратар шматлікіх выставак яна ставіла неардынарныя задачы і ўмела ствараць амбітныя праекты, што адкрывалі беларусам тое мастацтва, якое яны не вельмі добра ведалі, таму недзе і недаацэньвалі. Як крытык умела расставіць акцэнты і падтрымаць цікавых аўтараў. Пры тым, што спасцігала беларускае мастацтва сама. Разам з бацькамі ездзіла па розных гарадах СССР,

але вырашыла выбраць Мінск: як гісторык мастацтва атрымала дыплом БДУ.

Кірункам, на якім яна сканцэнтравалася як спецыяліст, стала сучаснае беларускае мастацтва. Яна гэтым захапілася настолькі, што заснавала Аўтарскую некамерцыйную канцэптуальную галерэю «Брама» — для Беларусі ў 90-я гады гэты было нешта абсалютна новае. Як можна ствараць выстаўкі канцэптуальна, прадумваючы да дробязей, і што куратар — таксама аўтар, можна было зразумець там. Таму што Ларыса Давідаўна была апантаным чалавекам, улюбёным у справу, у мастацтва і захопленым патэнцыялам Беларусі: папулярызавала айчынны жывапіс і графіку, умела прадставіць дэкаратыўна-прыкладное мастацтва так, што цуд, створаны чалавечымі рукамі, скараў не толькі нашых суайчыннікаў, але і замежнікаў. "Філасофская кераміка" — гэта яе выраз. І менавіта ёй належала ідэя правядзення Рэспубліканскага пленэру аб'ёмнага тэкстылю, які адбыўся ў 2012 годзе. Яе жыццё — прыклад таго, як адзін чалавек можа змяніць мастацкую прастору, калі становіцца рухавіком творчых працэсаў. Яна гарэла гэтым. Пры тым, што паспявала працаваць і як выкладчык, навуковец, сябра журы шматлікіх творчых конкурсаў.

Сябра секцыі мастацтвазнаўства і крытыкі Беларускага саюза мастакоў Ларыса Фінкельштэйн пайшла з жыцця на 74 годзе.

Ларыса ЦІМОШЫК

«ЛіМ»-люстэрка

Беларусь і Кітай падпісалі пагадненне аб сумеснай кінавытворчасці, інфармуе БелТА. Подпіс пад дакументам паставілі генеральны дырэктар «Беларусьфільма» Юрый Аляксей і акцёр кіно і тэлебачання, прадзюсар Лэй Хань. На цырымоніі прысутнічалі міністр культуры Беларусі Анатоль Маркевіч і Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол КНР у Беларусі Се Сяаюн. «Адносіны з нашымі кітайскімі партнёрамі мы ніколі не ставілі на паўзу, — адзначыў Анатоль Маркевіч. — Нават у няпростыя часы пандэміі мы працавалі. Можа, не так актыўна, як хацелася б, але, тым не менш, абменьваліся інфармацыяй і планавалі далейшую работу. Цяпер мы выходзім на зусім новы ўзровень у кінематаграфіі, таму што па іншых праектах у нас вельмі цесныя ўзаемаадносіны».

Днямі адбылося падпісанне пагаднення аб супрацоўніцтве і парнёрстве паміж заслужаным калектывам Рэспублікі Беларусь «Музычная капэла "Санорус" Мінскай вобласці» і пісьменнікам, заслужаным работнікам культуры Расійскай Федэрацыі Барысам Косціным. Пагадненне прадугледжвае выкананне літаратурна-музычнага паказу «Уладзімір і Рагнеда» ў Беларусі і Расіі ў 2024 годзе. У яго аснове — аўтарскі літаратурны зборнік з аднайменнай назвай.

Выстаўка школьных музеяў Расіі і Беларусі адкрылася ў Музеі Перамогі ў Маскве. Як паведамляе БелТА, падчас праграмы «Школьны музей Перамогі» прадстаўлена экспазіцыя «Подзвіг вялікі і вечны», падрыхтаваная музеямі адукацыйных устаноў Масквы, Цвярской вобласці і Беларусі. Праект прысвечаны гісторыі баявога шляху 158-й стралковай Лёзненска-Віцебскай двойчы Чырванасцяжнай ордэна Суворава дывізіі. Наведвальнікі могуць азнаёміцца з ваеннай формай і асабістымі рэчамі байцоў, дакументамі, архіўнымі фотаздымкамі, лістамі франтавікоў і іх родных, а таксама даведацца, як у Беларусі адбываюцца пошукавыя работы і як знаходзяць сваякоў загінулых байцоў, бліжэй пазнаёміцца з гісторыямі герояў дывізіі, якія вызвалялі Беларусь, убачыць унікальныя экспанаты, што захоўваюцца ў школах. Экспазіцыя будзе працаваць у Музеі Перамогі да 6 снежня.

Тым часам працягваецца арт-тур-шоу «Артэфакт» беларускай мастачкі Вікторыі Валюк. Сутнасць праекта заключаецца ў тым, што аўтарскія мініяцюрныя работы змяшчаюцца ў бутэлькі і пакідаюцца ў таемных месцах у розных частках свету. Той, хто знойдзе адну з такіх калекцыйных карцін, можа пакінуць яе сабе. Творы падпісаны на абароце, маюць уласны нумар. Новая карціна Вікторыі Валюк была пакінута на іспанскім востраве Тэнерыфе ў сярэдзіне лістапада. Гэта артэфакт № 43 «Кветкавы дыван». Арганізатары прапануюць арыенціры для пошуку. Так, апошняе палатно было сфатаграфавана на фоне вулкана Тэйдэ.

Міжнародны фестываль класічнай музыкі «Студзеньскія музычныя вечары» будзе праходзіць з 9 да 12 студзеня ў Брэсце. Аб гэтым паведаміў на прэс-канферэнцыі начальнік упраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама Сяргей Панасюк. Свой удзел у музычным форуме пацвердзілі выканаўцы з сямі краін: Арменіі, Балгарыі, Грузіі, Кітая, Расіі, Сірыі і Беларусі. Усе канцэрты пройдуць у Брэсцкім акадэмічным тэатры драмы. «Яшчэ вядуцца перагаворы. Не выключана, што колькасць краін-удзельніц павялічыцца. Разглядаем магчымасць правядзення дабрачыннага канцэрта для нашых медыкаў. Калі ўсё атрымаецца, плануем правесці яго на базе Брэсцкага музычнага каледжа», — расказаў Сяргей Панасюк. Арганізатары — Брэсцкае абласное музычнае таварыства, абласны і гарадскі выканаўчыя камітэты, Міністэрства культуры.

Студыя *Warner Music* працуе над біяграфічным фільмам пра французскую спявачку Эдзіт Піяф. Яе аблічча аднавяць пры дапамозе штучнага інтэлекту — выява і голас Эдзіт Піяф будуць згенерыраваны алгарытмам. Фільм «Эдзіт» будзе ісці 90 хвілін, раскажа пра жыццё і кар'еру артысткі з 1920 да 1960-х гадоў. У баёпіку таксама выкарыстоўваюць анімацыю, архіўныя кадры, запісы інтэрв'ю і іншыя крыніцы. Як перадае *Variety*, карціна ўхвалена спадчыннікамі сусветнай зоркі. Спявачку ўжо ўвасабляла на экране французская актрыса Марыён Каціяр у стужцы «Жыццё ў ружовым колеры» 2007 года. За гэтую ролю артыстка атрымала прэміі «Оскар» і «Залаты глобус».

Стрымінгавы сэрвіс *Netflix* запусціў сёмы сезон анталогіі «Чорнае люстэрка», гаворыцца на партале *film.ru*. Дэталі сюжэта новых серый не раскрываюцца. Вытворчасць стартуе да канца года. На пасаду шоўранера вернецца стваральнік «Люстэрка» Чарлі Брукер. Нагадаем: шоу дэбютавала ў 2011 годзе і расказвала пра негатыўны ўплыў тэхналогій на паўсядзённае жыццё людзей. Шосты сезон выйшаў у чэрвені; у ім здымаліся Сальма Хаек, Аарон Пол, Джош Хартнет і іншыя артысты.

Цікавінкі ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

Ігар ЛАПЁНАК:

«Галоўнае — максімальна наблізіць крамы да пакупнікоў»

Можна сказаць, што кніжны гандаль па-ранейшаму не страчвае сваіх пазіцый, а, магчыма, набірае новыя абароты. Рэгіянальны філіял «Гродна-кніга», які ўваходзіць у склад ААТ «Белкніга», імкнецца задаволіць сваіх наведвальнікаў самай разнастайнай кніжнай прадукцыяй. Гэтаму спрыяе і цеснае супрацоўніцтва з беларускімі выдавецтвамі. Аб новых падыходах у рабоце «Гродна-кнігі» — у інтэрв'ю з дырэктарам рэгіянальнага філіяла Ігарам Лапёнкам.

— Ігар Уладзіміравіч, якой вы бачылі сваю работу ў кніжным гандлі, калі прыйшлі сюды пяць гадоў таму? Вам жа давялося даволі значна змяніць сферу дзейнасці — ад прафесіі ваеннага да менеджменту.

— Калі пачынаў сваю дзейнасць на пасадзе дырэктара рэгіянальнага філіяла «Гродна-кніга», ведаў, што тут даволі моцны прафесійны калектыў, з добрымі гандлёвымі вынікамі, з добрым вопытам. Таму галоўнай сваёй задачай падчас прызначэння на гэтую пасаду лічыў развіццё тых напрацовак, якія ўжо былі і маглі садзейнічаць рабоце ў кніжным гандлі. У першую чаргу пачаў шукаць рэзервы на месцах. У гэтым плане палічыў неабходным упарадкаваць функцыі загадчыкаў крам, каб скіраваць іх на выкананне галоўных задач. Гэта датычыла як кадравага забеспячэння, так і тэхнічных пытанняў утрымання будынкаў, іх рамонту. Таксама была звернута ўвага на гандлёвае абсталяванне — у большасці крам яно патрабавала замены. У сувязі з гэтым правялі невялікую рэканструкцыю.

Ну і, безумоўна, важна захаваць поўнае ўзаемадзеянне са структурамі ААТ «Белкніга» і іншымі пастаўшчыкамі. Важна, каб пастаўкі ішлі пастаянна і ў добрым асартыменце.

— Ці адкрылі вы ў сабе нейкія новыя бакі, якія да гэтага часу не былі рэалізаваны?

— Безумоўна, кожная пасада раскрывае штосьці новае. Але дабіцца поспеху можна толькі пры вельмі дакладным вывучэнні новай сферы дзейнасці. Такія моманты былі і тут. Асноўнае — гэта гандаль. Таму гэты кірунак прыйшлося вывучаць, зразумець сам працэс гандлю, як ідзе работа з пастаўшчыкамі. Вывучыць схему паставак, асартымент. Ну і трэба вырашаць бягучыя пытанні. Каб кіраваць кнігагандлёвым прадпрыемствам, неабходна на адной мове размаўляць з тым персаналам, які тут працуе.

— Як вядома, у гандлі ў асноўным жаночы калектыў, кніжны — не выключэнне. Як наладжвалі работу?

— Галоўнай задачай было захаваць асноўнае ядро, захаваць нашы кадры, якія працавалі і працуюць у сетцы. Быў шэраг крам складаных, дзе даводзілася даволі шчыльна займацца кадрамі. Гэта вынік не аднаго дня, таму фарміраванне калектыву, асабліва ў вялікіх гандлёвых кропках, патрабуе часу, уважлівага падбору кадраў.

Лічу, важна, каб чалавеку было цікава працаваць.

Бо калі прадавец не працуе з пакупніком, не працуе на выкладках, гэта не дае ніякага выніку. І тут якраз і былі новыя моманты работы, у тым ліку і работы з калектывам. Сапраўды, калектыў жаночы, але знайсці агульную мову не складала асаблівай цяжкасці. Галоўнае — улічваць акалічнасці, якія не аддзяляюць ад жыцця — і сямейна-бытавыя, і праблемы здароўя. Гэта вельмі істотна ў кіраванні калектывам. І тут варта ісці па шляху найбольшай спрыяльнасці нашым работнікам, каб калектыў адчуваў і падтрымку, і зацікаўленасць кіраўніцтва ў вырашэнні асабістых праблем. Ад гэтага залежыць маральны-псіхалагічны клімат у калектыве. Калі няма нервознасці, няўпэўненасці — адпаведна павышаецца ўзровень аддачы работніка. Людзі адчуваюць адказнасць, яны нераўнадушныя да працы, уносяць свае прапановы, да якіх мы абавязкова прыслухоўваемся.

Вось набліжаюцца навагоднія святы, і ўсе крамы пачнуць адпаведнае ўпрыгожванне, каб стварыць утульную атмасферу. Гэта таксама псіхалагічны момант, які варта падтрымаць. Нават такія дробныя пытанні павінны быць у полі зроку кіраўніка прадпрыемства.

— Ці складана падабраць персанал? Якія галоўныя патрабаванні?

— Раней вялася падрыхтоўка спецыялістаў менавіта кніжнага гандлю, цяпер такога няма, рыхтуюць проста прадаўцоў. Праўда, у іх ёсць азнаямляльны курс па гэтай тэме. Увогуле, працаваць могуць як гуманітарыі, так і людзі з тэхнічнай адукацыяй, якім цікава такая праца, якія любяць чытаць. У нас ёсць нават выкладчыкі, якія прайшлі падрыхтоўку на касавым абсталяванні, яны ўмеюць працаваць з пакупнікамі. Мы падтрымліваем сваіх спецыялістаў. У калектыве філіяла «Гродна-кніга» крыху больш за 80 чалавек персаналу. Вялікай цякучкі кадраў не назіраем.

— Даводзіцца наладжваць і новыя сувязі?

— Канешне. Адным з такіх момантаў можна лічыць цеснае ўзаемадзеянне са структурамі нашага галаўнога прадпрыемства «Белкніга». У тым ліку аператыўна вырашаць пытанні з закупкамі і пастаўкамі кніжнай прадукцыі. Асабліва падчас падрыхтоўкі да новага навучальнага года.

— Як вялася работа па пастаўках вучэбных дапаможнікаў? Ад чаго залежыць іх своечасовасць?

— Ёсць некалькі фактараў, якія ўплываюць на наяўнасць навучальна-метадычнай літаратуры, дапаможнікаў для педагогаў. Хаця гэтая літаратура выпускаецца ў Беларусі, не ўсе заказы выконваюцца своечасова. Затрымка можа быць звязана з пастаянным удасканаленнем дапаможнікаў. Да таго ж вучэбная літаратура стала праходзіць спецыяльнае зацвярджэнне Міністэрства адукацыі. Такі грыф сёлета атрымала ўся вучэбная літаратура. І момант пераходу патрабаваў пэўнага часу.

— Чым абумоўлены пастаўкі? Сам філіял можа ўплываць на заказ?

— Заказ фарміруецца з практыкі ўжо існуючых паставак, яны напрацаваны мінулымі гадамі. Мы бачым, якія дапаможнікі карыстаюцца найбольшым попытам, але вучэбныя праграмы мяняюцца. І некаторыя пазіцыі аказваюцца незапатрабаванымі. Таму было б пажадана атрымліваць новую вучэбную літаратуру на больш ранніх этапах, а не напярэдадні навучальнага года.

Немалаважны момант — гэта кошт. Растуць цэны на абсталяванне, іншыя расходныя матэрыялы, таму падымаецца кошт выдання. Але падыходзім да гэтага разумна — у нас ёсць абмежаванні па фарміраванні цаны, таму парытэт захоўваецца.

— Аб'ёмы паставак растуць ці застаюцца на адным узроўні? Якім пазіцыям аддаецца перавага?

— У агульным плане аб'ёмы растуць. У верасні, напрыклад, прырост продажаў склаў 10 працэнтаў да мінулага года. Мы сталі больш набываць кніг і бачым, што ў іх ёсць патрэба. Сярод сталага насельніцтва добра разыходзяцца календары розных відаў — ад настольных да адрыўных. Іх цяпер вялікі выбар. Блізкасць да навучальных устаноў таксама накладвае свой адбітак. Мы стараемся задаволіць розныя заказы. Звярталіся да нас, напрыклад, з папраўчай установы Гродна. Людзі, якія адбываюць пакаранне, прыслалі нядаўна пісьмо-заяўку на літаратуру — там і слоўнікі, і мастацкая літаратура, філасофія, псіхалогія. Ёсць у нас інтэрнэт-крама, паслуга «Кніга поштай».

— Хто самыя буйныя заказчыкі?

— Што датычыць мастацкай літаратуры, значную частку заказаў складаюць нашы бібліятэкі. З бібліятэчнай сістэмай наладжаны добрыя шматгадовыя кантакты. Большасць кніг прадстаўлена нашымі беларускімі выдавецтвамі, таксама вядзецца работа з расійскімі пастаўшчыкамі. Гэта датычыць і навінак — хітоў продажу. Тут таксама адпрацаваны сувязі. Працэс ідзе пастаянна. Усе заказы, патрэбы нашых кніжных крам, ідуць знізу. Адпрацоўваюцца прайсы ўсіх пастаўшчыкоў, якія затым паступаюць у «Белкніга» — наша галаўное прадпрыемства.

— Хто на месцах можа паўплываць на фарміраванне заказу? Напрыклад, мясцовыя улады…

— Мясцовыя ўлады альбо прадпрыемствы ці ўстановы могуць ініцыіраваць заказ таго ці іншага выдання. Так адбылося з выпускам кнігі «Генацыд беларускага народа». Попыт быў даволі вялікі. У сваю чаргу, мы ставім заслону пранікненню на нашы прылаўкі літаратуры экстрэмісцкага зместу, тым выданням, якія не адпавядаюць нашым маральным прынцыпам. Такую літаратуру мы адсочваем, бо яна таксама з'яўляецца на рынку. Гэтая работа вядзецца сістэматычна, пастаянна праглядаецца спіс тых выданняў, якія не рэкамендуюцца да продажу і могуць прынесці шкоду нацыянальнай бяспецы. Гэтая інфармацыя пастаянна абнаўляецца і патрабуе ўвагі. Адсочваем сайты антыманапольнага рэгулявання і цэнтра гігіены. Гэта дае магчымасць пазбегнуць няякаснай прадукцыі, якая можа ўтрымліваць шкодныя рэчывы, напрыклад, у дзіцячых цацках, акварэльных фарбах і нечым іншым. Такія моманты бываюць рэдка, але іх таксама трэба ўлічваць і прапаноўваць пакупнікам толькі якасную і бяспечную прадукцыю.

— Кніжныя крамы сёння прадстаўляюць даволі шырокі спектр тавараў…

— Акрамя друкаванай прадукцыі, вучэбна-метадычнай літаратуры ў нас ёсць тавары канцылярскія, для дзяцей, розныя сувеніры. Мы звяртаем увагу на наяўнасць дзяржаўнай сімволікі ў нашых крамах. Прадпрыемствы, арганізацыі, простыя грамадзяне могуць купіць дзяржаўную сімволіку ў поўным аб'ёме. Стараемся прадставіць разнастайны асартымент, каб чалавек, які зайшоў у кніжную краму, мог набыць яшчэ і іншы тавар. Карыстаюцца попытам развіццёвыя гульні для дзяцей. Асабліва стараемся акцэнтаваць на гэтым увагу падчас канікул, калі дзеці дома. Тыя бацькі, якія думаюць аб развіцці сваіх дзяцей, могуць разлічваць на нашу дапамогу.

— Магчыма, ёсць кніжная прадукцыя, якая асабліва запатрабавана?

— Нашу краіну наведвае шмат замежнікаў, у Гродна прыязджае нямала беларускіх турыстаў, якія купляюць і сувенірную прадукцыю, і мастацкую літаратуру. Ёсць у нас і ручнікі, і льняныя вырабы, сувеніныя талеркі, кубкі. Некаторыя цікавяцца фотаальбомамі. Разам з тым адчуваецца недахоп прадукцыі менавіта турыстычнага зместу — буклетаў, даведнікаў, недарагіх альбомаў, паштовак. Гэта пастаянна запатрабавана. Многае мяняецца, гэты момант трэба ўлічваць. Таму шукаем пастаўшчыкоў, працуем з нашымі прадпрыемствамі. Выходзім на дамову са Слонімскай фабрыкай мастацкіх вырабаў, якая будзе пастаўляць сваю прадукцыю — вышыванкі, сурвэткі з нацыянальнымі матывамі, вырабы з разьбой па дрэве і многае іншае.

— Які сезон можна лічыць найбольш гарачым і спрыяльным для філіяла?

— У кожнай спецыялізаванай крамы ёсць свой гарачы сезон. І кніжны гандаль не выключэнне. У нашай вобласці налічваецца 12 кропак гандлю Гродзенскага філіяла «Белкніга». Звычайна актыўнасць нашых пакупнікоў узрастае напрыканцы лета, калі ідзе падрыхтоўка да навучальнага года. У асенне-зімовы перыяд, калі людзі больш знаходзяцца дома, таксама з'яўляецца патрэба чытаць. Многія цікавяцца выданнямі па рукадзеллі — тут вельмі шырокі выбар. Падчас свят купляюць падарункі, у тым ліку кнігі. Да летняга сезона мы прапануем тавары для школьных летнікаў, дзіцячых садкоў — тыя ж гульні, складанкі, цацкі, канструктары. Таму ў кожным сезоне ёсць група тавараў, цікавая для пакупнікоў.

— Вы адзначылі, што філіял налічвае 12 крам. Гэта аптымальная колькасць?

— У нас склалася ўстойлівая сетка крам па вобласці. Палова з іх — у абласным цэнтры. У першую чаргу нам важна, каб крама была рэнтабельнай. Ад гэтага

паліцах

БЕЛКНІГА

залежаць зарплата і прэміі гандлёвым работнікам. Таму стараемся максімальна аптымізаваць колькасць персаналу, мінімізаваць затраты. Разам з тым гэта не павінна паўплываць на знешняе аблічча, абсталяванне, ацяпленне, бяспеку і іншае. На гэтым эканоміць нельга. У кніжных крамах павінна быць камфортна і прадаўцам, і пакупнікам.

На перспектыву разглядаем магчымасць адкрыцця гандлёвых пунктаў у двух маладых мікраёнах Гродна. Тут пражывае многа маладых сем'яў. Будзем імкнуцца максімальна наблізіць нашы крамы да пакупнікоў.

— Вы пераймаеце вопыт у іншых ці, можа, да вас ужо прыязджаюць павучыцца?

— У філіялах «Белкнігі» працуюць прафесійныя кадры, многія даволі даўно. Мы сустракаемся на семінарах, а таксама пры падвядзенні вынікаў работы. Пастаянна на сувязі з калегамі з іншых рэгіёнаў. Я вельмі ўдзячны ўсім за падтрымку і парады. Вучыцца ніколі не позна. Нават тады, калі здаецца, што ведаеш усё. Бо жыццё часам падкідвае такія моманты, калі трэба з кімсьці параіцца. Да таго ж удасканальваецца і сістэма гандлю, і сістэма паставак, і ў заканадаўстве адбываецца шмат змяненняў, на якія трэба своечасова рэагаваць.

— Ці ёсць супрацоўніцтва з Выдавецкім домам «Звязда»? Тут выпускаецца ў асноўным беларускамоўная літаратура…

— У нашых крамах абсталяваны месцы, дзе мы выстаўляем літаратуру беларускіх выдавецтваў, у тым ліку шырока прадстаўлены і Выдавецкі дом «Звязда». Гэта літаратура як для дарослых, так і для дзяцей. Усё, што выходзіць з друку, трапляе да нас на прылавак, і пакупнік мае хуткі доступ да гэтай літаратуры. Чалавек толькі зайшоў у краму — і бачыць гэтыя паліцы. Беларуская літаратура мае прыярытэт. Так і павінна быць. Трэба, каб пакупнік не шукаў, а бачыў яе адразу. І школы добра бяруць, і турысты. Напрыклад, «Дзікае паляванне караля Стаха» Уладзіміра Караткевіча стала лідарам продажу мінулага года.

Мы бачым, што ёсць попыт на беларускамоўную літаратуру. Прыемна, што гэтыя працэсы стымулюцца і ў навучальных установах, і ў нашых грамадзян. Я таксама аддаю перавагу літаратуры на беларускай мове.

— Што асабіста вы чытаеце? Літаратура для адпачынку ці пазнавальная? А можа, адкрылі для сябе новую сферу?

— Калі раней захапляўся гістарычнай мастацкай літаратурай, цяпер хочацца чытаць гістарычную дакументалістыку. Атрымаць адказы на пытанні: адкуль мы? чым адметныя? адкуль вядзецца наша дзяржаўнасць і як развівалася свядомасць народа? На гэтым у рэшце рэшт завязваецца наш светапогляд і самабытнасць. Адсюль фарміруюцца адносіны да сябе, да краіны, і гэта вельмі значны і адказны момант. Такая навуковая літаратура, можа, і складаная для ўспрымання, але яна ўтрымлівае тое, чаго моладзі сёння не хапае. Можа, да гэтага яшчэ прыйдзем з часам. Агульнымі намаганнямі.

Маргарыта УШКЕВІЧ,
фота аўтара

Літаратура для ўсіх

«Веды»

Кнігарня — адна з найстарэйшых у горадзе, пачала дзейнічаць яшчэ ў 60-я гады мінулага стагоддзя. Гродзенцы ведалі яе пад назвай «Школьнік». Гэта было абумоўлена і блізкасцю навучальных устаноў, у тым ліку двух універсітэтаў. Таму аб'ём навуковай літаратуры тут застаецца адным з самых вялікіх. Тым не менш сюды прыходзяць і па мастацкую літаратуру, якая прадстаўлена даволі шырока. Паколькі крама знаходзіцца побач з чыгуначным вакзалам, сюды часта заходзяць і пасажыры цягнікоў. Многія набываюць сувеніры, календары.

— Паступілі вельмі змястоўныя і прыгожыя беларускія календары з відамі архітэктурных славутасцей Гродзеншчыны, «Белпошта» прадставіла цікавыя паштоўкі, стылізаваныя пад 50—60-я гады. Яны насычаны колерам і кожная са сваім сюжэтам, — расказвае загадчыца крамы Ірына Зялёнка.

На паліцах можна ўбачыць літаратуру, прысвечаную старажытным сядзібам Гродзеншчыны, Выдавецкага дома «Звязда». Дарэчы, рэгіён прадстаўлены на асобным стэлажы. Ірына Тадэвушаўна зазначыла, што не хапае невялікіх брашур пра Гродна, іх проста няма. Праўда, нядаўна па просьбе філіяла друкарня выпусціла серыю паштовак з відамі Гродна, але гэтага недастаткова. Варта было б пашырыць асартымент фотаальбомаў з рознабаковай тэматыкай. Але гэта залежыць ад выдавецтваў і творчых аўтарскіх калектываў.

— У нас добры попыт на беларускую класіку, у тым ліку і на рускай мове. Гэтыя выданні, як правіла, купляюць у падарунак пры паездках у Расію. Вельмі папулярны ў гэтым плане Уладзімір Караткевіч. З сучасных беларускіх аўтараў чытаюць Алеся Карлюкевіча, Людмілу Рублеўскую, Кацярыну Хадасевіч-Лісавую. Асобны стэлаж прысвечаны гродзенскім пісьменнікам, — пракаментавала загадчыца крамы.

Яна звяртае ўвагу на вялікі выбар геаграфічных картаў. Кажа, што гэта заўважаюць і наведвальнікі. Ёсць у крамы і яшчэ адна цікавая асаблівасць. Навучальная літаратура тут прадстаўлена не па прадметах, як было раней, а па класах. Такую ідэю падказалі ў адным з выдавецтваў, маўляў, гэта французскі вопыт. Такім чынам, некалькі гадоў таму была зроблена перастаноўка. Новы падыход аказаўся даволі зручны як для прадаўцоў, так і для пакупнікоў.

«Праметэй»

Кніжная крама знаходзіцца ў самым цэнтры старога горада, на пешаходнай вуліцы. Яна самая ажыўленая ў горадзе. Большасць будынкаў узростам не адну сотню гадоў. У такім якраз і месціцца «Праметэй». Гродзенцы памятаюць гэтую краму як мінімум з 50-х гадоў, калі тут размяшчалася «Паліткніга». З цягам часу плошчы былі пашыраны і змянілася назва. Рэдка які турыст абмінае гэты гандлёвы пункт, які мае арыгінальны выгляд.

— Вітрыну афармляў дызайнер, майстар арыгамі, у гэтым наша фішка. Фігуры зроблены з паперы, побач шыльды з літаратурнымі цытатамі. Арыгінальна афармленыя вітрыны прываблiваюць як саміх гродзенцаў, так і гасцей горада, — кажа загадчыца Людміла Чарэпка.

Работнікі крамы звяртаюць увагу на беларускамоўную літаратуру, якая шырока прадстаўлена. Сярод работнікаў таксама ёсць аматары сучасных беларускіх аўтараў.

— Я заўсёды чакаю творы Наталлі Марчук, якая ставіць сваю гераіню ў розныя незвычайныя сітуацыі. Вельмі цікава і для дзяцей, і для дарослых. Чытаюць Паўла Гушынца, Кацярыну Хадасевіч-Лісавую. Кніга Алеся Карлюкевіча «Шубуршун» біла ўсе рэкорды продажу, твор, перакладзены на кітайскую мову, таксама карыстаўся попытам, — заўважае намеснік загадчыцы крамы Наталля Дзяшук.

Работнікі задаволены, што сёння надаецца значная ўвага менавіта беларускай літаратуры. Яны памятаюць той час, калі амаль нічога з яе не паступала, асабліва што датычылася дзіцячай літаратуры. А вось з выданнямі для падлеткаў пакуль таксама ёсць праблемы, такой літаратуры недастаткова. Кажуць, што складана прапанаваць нешта такое, што магло б прыцягнуць увагу чытача дадзенага ўзросту.

Таксама пастаянна запатрабаваны беларускія казкі для дзетак у малым фармаце, невялічкія кніжкі з малюнкамі.

З года ў год крама займае прызавыя месцы па рэалізацыі і прапагандзе беларускіх выданняў у рэспубліцы. Для нагляднасці на сценах развешаны партрэты беларускіх класікаў. Расце колькасць кніг на стэлажах. Прадстаўляць кніжную прадукцыю для работнікаў не складае асаблівай цяжкасці, бо яны самі сочаць за навінкамі і могуць параіць свой тавар наведвальнікам.

— Мы папулярызуем навінкі ў сацыяльных сетках, прыгожа прэзентуем кніжныя выданні, нават самі аўтары выказваюць падзяку. Шукаем для фота нейкі цікавы інтэр'ер альбо гарадскі ландшафт. Калі сам чытаеш, кнігу нескладана папулярызаваць. Стараемся гаварыць па-беларуску. Практыкуем раз на тыдзень абслугоўванне пакупнікоў на беларускай мове.

Дарэчы, ёсць попыт і на перакладную літаратуру. Напрыклад, вельмі хутка разышліся кнігі пра Гары Потэра, перакладзеныя на беларускую мову. Хоць яны і нятанныя. Гэтую нішу можна было б запоўніць перакладной літаратурай. У тым ліку і моладзь зачапіць, лічаць работнікі філіяла «Гроднакніга».

«Раніца»

Крама «Раніца», як і «Праметэй», знаходзіцца на цэнтральнай гістарычнай вуліцы Гродна. Яна вядома ў горадзе сваімі маштабамі — тут чатыры залы. Адну сцяну займае красамоўнае пано на кніжную тэму. Загадчыца Алена Яскілевіч праводзіць невялікую экскурсію.

— Нядаўна завяршыўся сезон падрыхтоўкі да навучальнага года, калі значным попытам карысталася вучэбная літаратура, цяпер больш бяруць календары. Да навагодніх свят мы падрыхтавалі сувеніры, падарункі, прыгожа афармленыя нататнікі, робім выкладкі да кожнага свята з адпаведнай прадукцыяй.

Загадчыца расказала, што да кожнага свята ёсць свая прыярытэтная прадукцыя. Напрыклад, жанчынам у падарунак бяруць кулінарныя выданні, літаратуру па дамаводстве, псіхалогіі, на тэму сямейных адносін. Многія купляюць у падарунак карціны па нумарах, «алмазныя» карціны. На вяселле ці на дзень нараджэння дзяцей бяруць фотаальбомы. Мужчынам — стыльныя нататнікі. Вельмі зручна прадстаўлены школьныя наборы — усё ў адным кейсе.

Адна з залаў поўнасцю прысвечана таварам для дзяцей. Загадчыца робіць акцэнт на вялікай колькасці прадметаў для творчасці. Гульні, размалёўкі, энцыклапедыі для розных узроставых груп — ад 2 гадоў і далей.

Паколькі плошча крамы вялікая, пакупнікі могуць скарыстацца інфакіёскам, які ўстаноўлены непадалёку ад уваходзе. Тут інфармацыя па кожным тавары. Дастаткова набраць назву выдання альбо прозвішча аўтара, як з'явіцца ўся інфармацыя. Таксама крама абсталявана сістэмай відэаназірання.

Алена Яскілевіч робіць акцэнт на папулярнасці беларускіх выданняў. Тут, кажа яна, самы вялікі выбар — прадстаўлены ўсе беларускія выдавецтвы і ўся літаратура, якая выдаецца ў Беларусі.

Маргарыта УШКЕВІЧ,
фота аўтара

Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.

Жывы паслядоўны расповед

Нішто не з'яўляецца з ніадкуль. Кожная з'ява культуры мае за сабой гурт зацікаўленых, а часам аднаго чалавека, які зрушвае справу з месца. На жаль, з-за розных прычын мы не заўсёды аддаём такім людзям належнае, і вельмі прыемна, калі несправядлівасць выпраўляецца. У выдавецтве «Беларуская навука» ў 2023 годзе пабачыла свет манаграфія, прысвечаная збіральніку і першаму папулярызатару нашых народных спеваў — Антону Грыневічу.

Абапіраючыся на працы папярэднікаў, даследчыца песеннай культуры Яніна Грыневіч абагульніла звесткі пра нястомнага збіральніка фальклору, а таксама падзяліла ўласнымі архіўнымі росшукамі, аздабляючы багатай гістарычнай фактурай яго біяграфію.

Выхадзец з беззямельнай збяднелай шляхты Антон Грыневіч нарадзіўся 3 мая 1877 года, скончыў Дзісенскае гарадское вучылішча і з 19 гадоў жыў у Санкт-Пецярбургу, дзе працаваў на розных пасадах чыноўнікам. Паралельна атрымліваў адукацыю на вячэрніх курсах і курсах Шклоўскага кадэцкага корпуса. Тое ж і з адукацыяй музычнай — курсы, прыватныя ўрокі, саманавучанне і кансультацыі ў кампазітараў. Дзейнасць збіральніка-фальклярыста распачынае ўжо ў 1906 годзе.

Ашчаджаючы грошы з невялікага заробку (30—45 рублёў у месяц), ледзь не кожнае лета выбіраецца ў экспедыцыі. Адна з іх апісана відавочцам і прадстаўлена на старонках газеты «Наша ніва» (1911): «В. Жукоўка, Мінская губ. і пав. Нідаўна прыязджаў да нас с Пецярбургу сабіраець беларускіх песень — А. Грыневіч. Гоману, страху нават, а посьле сьмеху на ўсю вёску хапіло. Дурнейшыя людзі думалі раздзьмуць гэту чыста навучную справу — ў палітычную і напужаць вясковых. Але дурнямі ўсіх ня зробіш. Знайшліся і кабеты, і дзяўчаты з лепшым розумам, чым іншые мужчыны і ахвотна пайшлі запісаць мейсцовые песьні чэлавеку, каторы траціць дзеля гэтаго час, здароўе і грошы…»

Антон Грыневіч паступова распрацоўвае і удасканальвае методыку збору і апісання песень. Фіксуе словы і мелодыі, спрабуе вышукаць найбольш старажытныя матывы. З гэтай прычыны асаблівую ўвагу надзяляе непісьменным спявачкам, якія ніколі не выбіраліся ў горад. Паралельна заахвочвае сяброў-пісьменнікаў па пецярбургскім атачэнні, у тым ліку Янку Купалу і Язэпа Драздовіча, вясковых настаўнікаў, касцёльных арганістаў.

У кнізе асабліва падкрэсліваецца наватарства Антона Грыневіча ў справе папулярызацыі беларускай песні. Ён шчыра лічыў, што народны спеў павінен адыграць вялікую ролю ў выхаванні моладзі, а таксама ўвогуле беларусаў, у тым ліку праз народны тэатр, які ў тую пару нельга было ўявіць без танцаў і хору. Пачынае рыхтаваць дапаможныя матэрыялы.

Ужо на пачатку XX стагоддзя біў трывогу і папярэджваў, што адыходзіць старая спеўная традыцыя. У вёсках рэдка пачуеш старыя песні, а месца іх займае вульгарная лірыка.

Атрымаўшы выдавецкі досвед у суполцы «Загляне сонца і ў наша ваконца», у 1910 годзе адкрывае ўласную справу і выпускае зборнікі «*Bielaruskije piesni z notami*» (1910), «*Bielaruskije piesni z notami*» (1912) — першыя спеўнікі з песеннай творчасцю беларусаў у папулярным фармаце. Да таго ж друкуе кнігі Янкі Купалы і Якуба Коласа, Уладзіслава Галубка і інш. (па некаторых звестках, адзін са «спеўнікаў» з подпісам укладальніка яшчэ ў 1950-я гады захоўваўся ў сям'і Багдановічаў і, магчыма, быў перададзены з архівам паэта ў АН БССР).

Дзесьці «па-дзіцячаму наіўны» (Паўліна Мядзёлка) у сваёй адданасці беларускай справе, ён часам станавіўся ахвярай уласнай даверлівасці, у тым ліку і праз «паплечнікаў» па адраджэнскай справе. Чаго вартая згаданая ў кнізе гісторыя з невяртаннем «Нашай нівай» 257 рублёў за рэалізаваныя імі выданні Грыневіча.

Стваралася ўражанне, што не асабліва ўладкаваны па жыцці «збіральнік» адкрываўся кожнаму, хто праяўляў да яго справы хоць нейкі інтарэс і сімпатыю — пачынаў рабіць бясконцыя планы супрацы і добра, калі хоць якая частка іх рэалізоўвалася.



Не атрымлівалася наладзіць і асабістае жыццё. Так, сярод іншага прыводзіцца абвестка ў «Брачную газету», якая так і не была надрукавана ў ёй з-за падзей 1917 года: «Предст., интел., трудол., обязанности военный, 40 л. Желает жениться на дев. или один. вдове 30–40 л. симпатичной, мягкого нраву жел. полностью или отчасти обеспеч. либо капиталом либо делом, хозяйствен., специальным знанием необход. въ современной жизни и т.п. Посредница без аванса приемлема. Фот. карт. въ Редакціи. Писать серьезно съ указ. непосредств. адреса. Леонтьевский 17 ред. Сидоровой №…»

Хочацца яшчэ раз звярнуць увагу на тое, што ў кнізе прадстаўлена не сухая біяграфія, хаця Яніна Грыневіч абапіраецца на шматлікія дакументы і тагачасныя публікацыі, а жывы паслядоўны расповед, які раскрывае панараму беларускага адраджэння пачатку XX стагоддзя, а таксама дзейнасць першых беларускіх навуковых інстытуцый пасля ўсталявання савецкай улады.

Стракатая геаграфія, шматлікія паплечнікі і спадарожнікі, лёс самога Антона Грыневіча, які ва ўсёй гэтай каламесе рэвалюцый, войнаў і палітычнага пераследу працягваў сваю справу.

Добрай ілюстрацыяй гэтай «несупыннасці» з'яўляецца запіс, які збіральнік зрабіў у Лукішках, калі быў арыштаваны польскай дэфензівай:

«Дзе ты быў, дзядулька мой, дзе ты быў, міленькі мой,

На кірмашы, бабка, на кірмашы, любка, на кірмашы, сівая галубка…».

Акрамя непасрэдна самой манаграфіі, у кнізе прадстаўлены факсіміле выданняў: «*Bielaruskije piesni z notami*» (1910), «*Bielaruskije piesni z notami*» (1912), «Народны сьпеўнік: на 1—3 галасы» (1920), «Школьны сьпеўнік» (1920), «Беларускі дзіцячы сьпеўнік з беларускіх народных матываў і лірыкі, сабраных ў 1905—1924 гг.» (1925), брашура па выхаванні «Як трымацца змалку» (1920), падборка сабраных песень, у тым ліку ад знакамітых дзеячаў беларускай культуры.

Дзеля навучання беларусаў музычнай справе па-беларуску Антон Грыневіч распрацоўвае ўласную музычную тэрміналогію: «нотная драбінка» (аналаг нотных лінеек), «адступы» (інтэрвалы), «звышок» (дыез), «зніжок» (бемоль), «зваротнік» (бекар), «пераважка» (сінкопа), «лучка» (ліга), «тонаход» (гама), «клінчык» (легата), «моцка» (акцэнт) і г.д., якія павінны былі спрасціць разуменне нотнай граматы для дзетак і малапісьменных аматараў спеваў, бо чужаземныя словы «мучылі памяць і туманілі разуменне». У той жа час падкрэсліваў важнасць вывучэння універсальных італьянскіх абазначэнняў, «каб магчы карыстаць нотамі ўсяго сьвету».

Праглядаючы факсіміле дзіцячых спеўнікаў, вочы выхапілі знаёмыя:

«Ладу, даду, ладкі
А дзе жылі? Ў Бабкі.
А што елі? — Кашку.
А што пілі? — Бражку»…

І такое:

«Ку-ю, ку-ю но-жку, па-е-ду ў да-ро-жку,
Да-ро-жка кры-ва-я, ка-былка сьля-па-я…»

І зрабілася крыху вусцішна, што ў дзяцінстве мог не пачуць гэтых радкоў з вуснаў старэньких ужо дзядулі і бабулі. Тое ж і пра іншыя, «дарослыя» песні, якія сталі неад'емным кодам нашай культуры і захаваліся ў тым ліку праз руплівасць Антона Грыневіча.

Кніга «Як нацыя вучылася спяваць…» прысвечана памяці настаўніка Яніны Грыневіч — Арсеня Ліса. Падаецца, што ён быў бы ўсцешаны, прачытаўшы працу сваёй вучаніцы.

Міхал БАРАНОЎСКІ

Сувязісты прадставілі грунтоўнае выданне

Нядаўна пабачыла свет навукова-папулярнае выданне «Гісторыя электрасувязі Беларусі». Аўтары — кандыдат гістарычных навук С. А. Сідарава (гістарычныя раздзелы) і Ю. М. Мацяш (біяграфічныя даныя, інтэрв'ю, раздзел «Сучаснасць»).

Яе змест ахоплівае перыяд ад XIX — пачатку XX ст. і да сучаснасці. Прачытаўшы кнігу, вы даведаецеся пра вытокі, станаўленне сувязі, пра час выпрабаванняў для галіны ў 1914—1941 гадах, пра дзейнасць сувязістаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, перанясецеся ў 1945—1980 гады — ад перыяду часовай сувязі і да ўзнікнення тэлетайпу, а таксама будзеце ведаць пра самыя значныя вехі, што прыпалі на 1980—1995 гг. Завершыце вандроўку па гісторыі электрасувязі нашымі часамі. У кнізе знойдзеце інфармацыю аб кіраўніках РУП «Белтэлекам» на працягу ўсёй гісторыі існавання арганізацыі, таксама пра міністраў сувязі ад савецкага часу да сённяшняга дня.

«У выданні знойдуць адбітак ўспаміны тых, хто імкнуўся хоць крыху, але апярэдзіць свой час: хто з катушкай праваду адпраўляўся ў самыя аддаленыя куткі краіны і разглядаў наваколле з вышыні тэлеграфнага слупа; хто нават пад ударамі варожай авіяцыі заставаўся каля камутатара і ўжо пасля вайны аб'ядноўваў гарады, краіны і кантыненты новымі

лініямі; хто ўпершыню пазнаёміў беларусаў з глабальным сецівам інтэрнэт, каб пасля прыступіць да стварэння лічбавага грамадства», — такія словы адрасаваў чытачам генеральны дырэктар РУП «Белтэлекам» Юрый Петручэня.

Улічваючы шматпланавасць і ўнікальнасць кнігі, яна будзе вельмі карысна і студэнтам-сувязістам, і ўсім, хто цікавіцца гісторыяй станаўлення і развіцця не толькі электрасувязі на тэрыторыі нашай краіны, але і РУП «Белтэлекам» — ключавога тэлекамунікацыйнага аператара Рэспублікі Беларусь.

Выданне багата на ілюстрацыйны матэрыял. На яго мелаваных старонках — вялікі пласт інфармацыі, у тым ліку інтэрв'ю сучаснікаў і статыстычныя даныя. Кніга аздоблена фотаздымкамі, сканамі перыядычных выданняў, мемуарных запісаў, архіўных дакументаў, два з якіх аддрукаваны на паперы-кальцы. Ёсць і ўкладыш з асноўнымі вехамі развіцця электрасувязі.

«Я ўпэўнены, што кніга будзе цікавая шырокаму колу чытачоў, але ў першую чаргу яе з хваляваннем адкрыюць ветэраны і цяперашняе пакаленне "Белтэлекама"», — напісаў у прывітальным слове міністр сувязі і інфарматызацыі Канстанцін Шульган.

Па словах стваральнікаў, да нядаўняга часу не ажыццяўлялася настолькі знакавых спроб сабраць, абагульніць і прадставіць шырокай грамадскасці кнігу, у якой былі б сістэматызаваны вынікі доўгай архіўнай, навуковай працы. У кнізе ўсё гэта дапоўнена каментарыямі тых, хто штодзённа на працягу многіх гадоў умацоўваў прэстыж прафесіі сувязіста, ствараў традыцыі і перадаваў бясцэнны вопыт наступнаму пакаленню.

Як гавораць ініцыятары праекта, каштоўнасць кнігі ў тым, што гэта не перадрукоўка пэўных існуючых фактаў і ведаў, а першае комплекснае навукова-папулярнае выданне ў галіне.

— Гэта першае выданне, дзе комплексна разгледжана тэма электрасувязі: тэлеграфа, радыё і тэлебачання. Мы знайшлі вялікую колькасць новых фактаў, якія нарэшце занялі сваё месца ў гэтай кнізе, — патлумачыла аўтар, кандыдат гістарычных навук Святлана Сідарава.

Навукоўца дадала, што ў кнізе прадстаўлены факты, дакументы і фотаздымкі, якія доўгі час захоўваліся ў архівах, музеях і прыватных калекцыях, раней не публікаваліся. У працэсе работы былі алічбаваны і захаваны рукапісныя ўспаміны вэтэранаў-сувязістаў, знойдзены аўдыя- і відэадакументы.

У падрыхтоўцы выдання дапамагалі сувязісты. Яны не толькі ўдзельнічалі ў працэсе збірання значнага масіву інфармацыі, але і ўдыхнулі ў яго жыццё. Аўтары кнігі выказваюць удзячнасць вялікай колькасці спецыялістаў, якія зрабілі ў'нёсак у важны і амбіцыйны праект.

Аднак гэта толькі пачатак, лічаць стваральнікі праекта. Працуючы над кнігай, навукоўцы сабралі мноства дакументаў, фотаздымкаў, успамінаў, якія не ўвайшлі ў гэтае выданне, але далі зразумець: яно будзе не апошнім. Наперадзе яшчэ нямала работы: не ўсе аспекты даследаваны, не паўсюль знойдзены вычарпальныя даныя. Упісаць у кнігу гісторыі неабходна яшчэ шмат радкоў, кажуць стваральнікі праекта. І для плённай супрацы цяпер ёсць трывалы фундамент, упэўнены яны.

Надзея ЗУЕВА
Фота дадзена РУП «Белтэлекам»

Станьце, людзі, на калені…

Калі апошнім часам выяўляюцца новыя і новыя факты генацыду беларускага народа фашыстамі, усё больш упэўніваешся, што ў гэтых брудных справах гітлераўцам няма роўных.

Аднак з цягам часу шмат што і «забывалася». Найперш дзеля наладжвання трывалых сувязей з той жа Германіяй. Толькі хатынскія званы, пастаўленыя на месцы сімвалу знішчэння акупантамі мірных жыхароў, не змаўкалі ні ўдзень, ні ўночы. Калі ж уважліва прыслухацца да іх, то, здаецца, гэта адгукаюцца «галасы» помнікаў, пастаўленых па ўсёй краіне, па прынесеных ахвярах у гады Вялікай Айчыннай вайны. Толькі паступова голас з-за мяжы атрымаўся іншы, чым хацелася. Як і перад пачаткам нашэсця, недабітыя гітлераўскія ваякі, а таксама дзеці і ўнукі іх, сталі заяўляць аб сваім праве наладжваць у суседзяў «новы парадак».

У беларусаў з'явілася так шмат «настаўнікаў», што дзіву даешся. І ўсе з жупелам так званай дэмакратыі. Ды мы ўжо не тыя. Галоўнае зразумелі: калі гаварыць усю праўду пра тое, як знішчалі гітлераўцы савецкіх людзей, у тым ліку мірных, дзяцей, дык падаваць гэтую праўду трэба не прэпарыравана, не абмінаць нешта. Маю на ўвазе кнігі, прысвечаныя генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, а калі глядзець шырэй — у Другой сусветнай вайне. Асаблівую ўвагу выпуску іх, як вядома, надае выдавецтва «Беларусь». Не стаяць убаку і іншыя. У прыватнасці, Выдавецкі дом «Звязда», для якога творчым стымулам у гэтым стаў дэвіз: праўда і толькі праўда, якой бы страшнай яна ні была. Што гэта так, пераконвае і дакументальная аповесць-эсэ Анатоля Бензерука «Галавасек».

Назва ў дадзеным выпадку прадаўжае іншыя, узятыя фашыстамі з прэтэнзіяй на «арыгінальнасць». Нездарма гэтае слова бяру ў двукоссе. У дадзеным выпадку ў аснове яго такое, у што звычайнаму чалавеку, які заўсёды застаецца пры сваім розуме, страшна паверыць. Аднак толькі не падлюгам з… Прабачце, але калі дамовіліся гаварыць праўду і толькі праўду, то нельга не быць канкрэтным — з нямецкай пыхай звышчалавекаў.

У гэтым упэўніваешся ў самым пачатку твора: «Адгучала "Чароўная флейта" — падзьмуў "Цёплы вецер", адшугала "Майская навальніца" — надышло "Свята ўраджаю", прайшоў споры "Дождж на Сёмуху" — закружыў "Веснавы карагод", адбылося нарэшце "Асвячэнне храма"…»

Калі б не ведаў, што ў сапраўднасці азначаюць гэтыя назвы, што заўгодна падумаў бы. Нават нешта, звязанае з традыцыйнымі сялянскімі святамі, пасля якіх і хочацца пайсці ў храм. Так падумалася б, калі б гэтае сведчанне напаткаў асобна, не суадносна з тым, пра што гаворыцца ў кнізе далей. Яно ж такое, што ад успрымання страшна становіцца. Аднак яно і звычайнае. Толькі для ахвотных навучыць іншыя народы «жыць па-новаму». Як і дзейнічалі варацілы Трэцяга рэйха:

«Прыгожыя словы, паэтычныя.

Толькі справы — брыдкія.

Бо мы пералічылі сем (са ста сарака) карных аперацый, якія правялі акупанты ў Беларусі».

Аперацыя па знішчэнні разам з жыхарамі дзвюх вёсак на Брэстчыне — Зялёныя Буды на Маларытчыне і Драмлёва на Жабінкаўшчыне — называлася менш паэтычна — «Драйек», што ў перакладзе азначае «Трохкутнік». Назву ж «Галавасек» Анатоль Бензярук узяў невыпадкова: «Трагедыя адбылася ў пятніцу

«Галавасек», безумоўна, — найперш кніга-дакумент. Не столькі таму, што ў падзагалоўку і стаіць вызначэнне «дакументальная аповесць-эсэ», але і дзякуючы багатаму фактычнаму матэрыялу, а яшчэ, што, несумненна, важна, выстройванню яго так, каб ён не проста пераконваў, а па-свойму гаварыў, несучы, хай сабе ў разрэзе таго, што мы ведаем пра Вялікую Айчынную вайну, і невялікую праўду, хоць надзіва і трагічнага гучання. Толькі без малога, не будзем забываць, няма вялікага. Кожны новы штрых — вельмі важны. Тое, што тычыцца зверстваў нацыстаў, асабліва.

11 верасня 1942 года, на царкоўнае свята — Адсячэнне галавы Іаана Хрысціцеля, якое ў народзе завуць Галавасекам, Калінавікам, Крываўнікам, Галаварэзам, Сцянцелем».

Гітлераўцы былі яшчэ тымі галаварэзамі! Пра іх зверствы шмат напісана, а адкрываеш чарговую старонку генацыду беларускага народа, раскрытую Анатолем Бензеруком, і застываеш у ранейшым жаху. Асноўны аповед у дакументальнай аповесці-эсэ вядзецца ў асноўным пра апошнюю карную экспедыцыю, што адбылася ў Драмлёве. Удакладненне «асноўны» невыпадковае. Безумоўна, асноўны адрас росшукаў (а гэта праца ў архівах, ранейшыя публікацыі, звесткі тых, хто ў той ці іншай ступені быў відавочцам гэтых трагічных падзей) Анатоля Бензерука — узнаўленне падзей, звязаных з Драмлёвам. Дарэчы, гэтыя раздзелы, а іх пятнаццаць, названы аркушамі. Мастацкі прыём апраўданы, бо расказанае — свайго роду лісты (у сэнсе пасланне) як сённяшнім чытачам, так і тым, хто далучыцца да напісанага пазней, аб той памяці, якая забыццю не падлягае. Чым больш аддаляешся ад яе, тым большае значэнне яна мае. Аднак падзеямі ў Драмлёве Анатоль Бензярук не абмяжоўваецца. Згадваюцца і іншыя народныя трагедыі.

«Галавасек», безумоўна, — найперш кніга-дакумент. Не столькі таму, што ў падзагалоўку і стаіць вызначэнне «дакументальная аповесць-эсэ», але і дзякуючы багатаму фактычнаму матэрыялу, а яшчэ, што, несумненна, важна, выстройванню яго так, каб ён не проста пераконваў, а па-свойму гаварыў, несучы, хай сабе ў разрэзе таго, што мы ведаем пра Вялікую Айчынную вайну, і невялікую праўду, хоць надзіва і трагічнага гучання. Толькі без малога, не будзем забываць, няма вялікага. Кожны новы штрых — вельмі важны. Тое, што тычыцца зверстваў нацыстаў, асабліва.

У кнізе называюцца і тыя, хто спаліў гэтую вёску: «У знішчэнні Драмлёва ўдзельнічалі байцы 10-й роты III батальёна 15-га паліцэйскага ахоўнага палка пад кіраўніцтвам гаўптмана Заўра і обер-лейтэнанта Мюлера. Колькасць удзельнікаў "акцыі" — да сотні чалавек». Не забыты і імёны фашысцкіх прыслужнікаў. Ёсць, аднак, і галоўнае, што кнігу «Галавасек» робіць своеасаблівым помнікам мірным ахвярам фашызму. Анатоль Бензярук зазначае: «На сённяшні дзень, абапіраючыся на архіўныя дакументы і ўспаміны жыхароў Жабінкі і навакольных вёсак сталага ўзросту, з вялікай доляй верагоднасці можна пакінуць у спісе тых, хто не выйшаў жывым з агню 11 верасня 1942 года. Іх налічвалася 183 асобы (90 мужчынскага полу і 93 — жаночага), з іх 18 — ва ўзросце ад 0 да 4 гадоў, яшчэ дваццаць — ад 5 да 14 гадоў». Прозвішчы ўсіх пакутнікаў прыведзены ў спісе «Згадаем усіх пайменна».

Мужную кнігу напісаў Анатоль Бензярук, а, улічваючы сучасныя рэаліі, калі «цывілізаваны» свет настроены супраць Беларусі і Расіі, і актуальную. Не ведаю, як іншыя, а я, перагортваючы апошнюю старонку, успомніў хрэстаматыйны верш народнага паэта Беларусі Аркадзя Куляшова «Балада пра чатырох заложнікаў». Памятаеце яго заключныя радкі? — «Перад бацькам Мінаем // Станьце, усе бацькі, на калені!» Так і хочацца сказаць: станьце, усе сумленныя людзі планеты, на калені перад беларусамі, якія былі тымі, хто ўратаваў чалавецтва ад карычневай чумы фашызму.

Язэп ЛІТВІНОВІЧ

Дзе пасталеў душою

У зборніку літаратурна-мастацкіх твораў, выдадзенага да 895-годдзя горада Гродна, «Лепшы горад Зямлі» змешчаны творы 47 аўтараў, як членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі, так і аматараў. Ідэя стварэння яго належыць старшыні Гродзенскага аддзялення СПБ Людміле Кебіч.

Адкрывае кнігу артыкул «"Гродна мае твар адметны: горад-казка, горад-рай": ушанаванне Гродна пісьменнікамі Гродзенскага краю (да юбілейнага 895-годдзя горада)» лаўрэата Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі Аліны Сабуць, дзе яна піша: «Гародня, Гродна — каралеўскі горад замкаў, горад-гісторыя, горад-святыня. І для кожнага гарадзенца вялікі свет пачынаецца менавіта з той мясціны, роду-вытоку, дзе нарадзіўся і ўзгадаваўся, дзе пасталеў душою». І з гэтым нельга не пагадзіцца. У форме займальнай экскурсіі пісьменніца прапануе гістарычны агляд летапісных згадак, лірычных прысвячэнняў, краязнаўчых даследаванняў Гродна — ад сівой даўніны да нашых дзён. Нібыта крокі па старым бруку, гучаць імёны вядомых гараджан: палкаводца Давыда Гарадзенскага, навукоўца Жана-Эмануэля Жылібера, рэфарматара Антонія Тызенгаўза, педагога Яна Каханоўскага, пісьменнікаў Элізы Ажэшкі, Васіля Быкава, Аляксея Карпюка, Аляксея Пяткевіча, Дануты Бічэль і іншых. Шчодра цытуюцца і аналізуюцца іх тэксты.

З літаратурнымі прысвячэннямі сталіцы Прынёмання выступілі члены Саюза пісьменнікаў Беларусі і гарадскога літаб'яднання «Надзея», а таксама аўтары-пачаткоўцы. Акрамя паэзіі чытача чакаюць эсэ, малая проза і публіцыстыка, ёсць нават канспіралагічны нарыс.

Зборнік аздоблены каляровымі фотаілюстрацыямі, за што варта падзякаваць кніжнаму выдавецтву «ЮрСаПрынт». На адвароце вокладкі размяшчаюцца прысвечаныя Гародні выказванні Уладзіслава Сыракомлі, Зоські Верас, Васіля Быкава, Уладзіміра Караткевіча і Аляксея Пяткевіча.

Атрымалася універсальная, унікальная кніга-артэфакт, сапраўдны падручнік па «гродназнаўстве», які можа выкарыстоўвацца на ўроках пазакласнага чытання. Яшчэ гэта кніга-сувенір, якая мае гісторыка-культуралагічную каштоўнасць, кніга-падарунак на памяць, здольная зрабіць спатканне з горадам незабыўным. Назва — «Лепшы горад Зямлі» — мае іранічны характар. Пачуццё патрыятызму дазваляе жыхарам кожнага населенага пункта ў найлепшых танах выказвацца аб сваім родным кутку, дзе бяруць пачатак зямныя шляхі чалавека, народа, краіны. Тэма малой Радзімы невыпадкова застаецца для сучасных беларускіх літаратараў адной з галоўных. Новае выданне — вынік калектыўнай творчасці, візітная картка рэгіёна, наш адметны код у агульным арнаменце нацыянальнай культурнай спадчыны. У гарманічным спалучэнні элементаў рэгіянальнай культуры праяўляецца духоўная веліч шматнацыянальнай, шматканфесійнай Беларусі, такой рознай, непаўторнай для кожнага і адзінай для ўсіх. Сімвалічна, што на вокладцы выявы гродзенскіх славутасцей размясціліся на фоне геаграфічнага контура Беларусі. Геаграфія зборніка таксама рэгіянальная: сваім бачаннем літаратурнага вобраза Гродна, акрамя жыхароў горада, падзяліліся прадстаўнікі Слонімскага, Ваўкавыскага, Навагрудскага,

Смаргонскага, Шчучынскага, Воранаўскага, Гродзенскага раёнаў вобласці з напісанымі ў розныя гады творамі на беларускай і рускай мовах. Самаму юнаму з аўтараў зборніка — 17, самаму сталаму — 90 гадоў.

Мяркуем, што кніга будзе запатрабаванай настаўнікамі, школьнікамі, студэнтамі, навукоўцамі-даследчыкамі, краязнаўцамі і аматарамі літаратуры. Хутка адбудзецца яе прэзентацыя.

Дзмітрый РАДЗІВОНЧЫК

Галіна ЗАГУРСКАЯ

* * *

Бярозы свечкамі гараць
Між цёмных сосен,
Туман ахутаў луг і гаць.
Настала восень.

Світае позна на дварэ —
Амаль што ў восем.
Румяным стаў і клён стары.
Настала восень.

Бясшумна падае лісцё,
Не сохнуць росы.
І азіраеш зноў жыццё…
Настала восень.

* * *

Рассыпаў вечар зоры ў вышыні,
Сусвету абазначыўшы бясконцасць.
І ў гэтай паднябеснай цішыні
Душа мая аголена да донца.

У гэткі час удумна галаве.
Хаця спасцігнуць немагчыма Бога,
Ды зорка пакацілася ў траве —
І павяла нябесная дарога.

Такі прыгожы і чароўны час!
І Млечны Шлях разлёгся ў небе чынна.
Ну як жа свет абыдзецца без нас?!
Такое і ўявіць нат немагчыма.

* * *

Я спакою вучуся ў нябёсаў,
Быць імклівай мяне кліча вецер,
«Памяркоўнай будзь», —
шэпчуць мне росы,
Цішыню шанаваць вучыць вечар.

Напамін пра бадзёрасць шле ранак,
Прыгажосць спасцігаць вучаць ружы.
Пра адданасць нагадвае ганак,
А валун заклікае быць дужай.

Дуб гаворыць заўсёды пра цвёрдасць,
Трапяткою быць вучыць асіна.
Жураўлі мне курлычуць пра гордасць.
Я пяшчоце вучуся ў язміна.

Быць спагадлівай вучыць зямелька,
Не згінацца вучуся я ў сосен.
Упрыгожваць сябе вучаць ёлкі,
Навучае цвярозасці восень.

Лебядзіная вернасць — вось гэта
Ідэал, што ўладарыць над часам.
А яшчэ я вучуся ў Сусвету —
Не падвёў ён яшчэ ані разу.

* * *

Падаюць ціха, ледзь чутна ранеты,
Вожык прабегся цішком па траве.
Музыка льецца пяшчотна з Сусвету.
Зараз не спіцца старэнькай саве.

Музыка мройна гучыць з паднябесся,
Ціха садзіцца на грушу сава —
Клопат яе аб сваім інтарэсе,
Ходзіць кругамі яе галава.

Гэтак здабычу яна выглядае —
Ёй не да музыкі, пэўна, зусім.
Знічка мільгне ўвышыні залатая
Думкай, што ўсе перад Богам стаім.

Музыка доўга са мной застаецца,
І наплываюць туманна радкі…
Для ачышчэння душы нам даецца
Музыка ціхай нябеснай ракі.

* * *

У адну раку не ўвойдзеш двойчы, —
Мудрэц калісьці так сказаў.
Цячэ рака заўсёды моўчкі —
Не хоча ведаць нашых спраў.

Усё мяняецца, імкнецца:
Рака — да мора, а жыццё
То сціхне ўміг, то страпянецца,
Дыван то сцеле, то асцё…

І чуецца напруга ў плыні.
Жыцця аснова — гэта рух.
Без руху ў свеце ўсё застыне.
Жыццё — са шчасця і пакут…

* * *

Я рысы любыя прыпомню
Нясмела крыху і наўгад
Пад пазалочаныя промні
У вечар, што стаіць ля хат.

Цябе я ў думках намалюю
Пад вечароваю зарой
І ўспомню, што яшчэ люблю я
Такі далёкі вобраз твой.

Успомню я пад шэпат лісця
На нашай ліпе векавой,
Што для цябе была калісьці
Сама я ранішняй зарой.

Настрой вечаровы

Водная роўнядзь, пейзаж вечаровы.
Выйсце шукаюць затоена словы.

Золатам вечар паволі разліўся,
Для суцяшэння стварыўшы умовы.

Выгнуты лебедзяў шыі пытаннем —
Ад захаплення ўздымаюцца бровы.

Вечар чаруе бязмежным спакоем —
Ён быццам шле ад трывогі замовы.

Люстра вады. Свет прыгожы, чароўны.
Ціха падкраўся настрой вечаровы.

* * *

Усё туманіць час-свавольнік,
А кожны з нас яго нявольнік,
Ды не па сіле і яму
Той даўні знічыць фотаздымак,
Дзе мы ўдваіх на фоне кветак
І там усё ў палоне лета,
Яго спагадлівых абдымках.
Мы рады лету і ўсяму.

І побач матылёк лятае,
А кавалёк на чымсьці грае,
Стракоча так — займае дух.
Рамонак там да нас хінецца.
Вакол разлітая ўрачыстасць,
І ў душах — светла, у душах — чыста.
Няхай жа час далей імкнецца,
Там назаўсёды мы ўдваіх.

Тамара БЯРЭЗІНА

Кветкі восені

Міла адцвітаюць восеньскія кветкі,
У чаканні першых прымаразкаў
стынуць.
Лета залатога дажываюць сведкі:
Жаль бярэ, што хутка прыйдзецца
загінуць.

Яркасцю пялёсткаў мне душу сагрэюць,
Цеплынёю фарбаў прынясуць спакой,
Перш чым ад марозу краскі пачарнеюць
І зіма накрые ледзяной рукой.

Санет

Плывуць аблокі ў небе за акном.
Сад разам з намі моцна пастарэў,
Вятрамі лісце пазрывана з дрэў,
Перад зімой заснуў працяглым сном.

У шыбы восень стукае дажджом,
Увысі чую аднастайны спеў.
Там роўны клін журботна паляцеў,
З радзімым развітаўшыся гняздом.

Маркотнае хвалюе развітанне,
На доўгі час з Айчынаю расстанне.
Каб быў шчаслівым птушак пералёт,

Жадаю ім не аслабець крылом,
Бо цяжкім будзе дальні іх палёт,
Не ведаюць, дзе знойдуць мілы дом.

Трывога

Час ляціць імкліва —
Падрастаюць дзеці,
Сто дарог адкрыта
Ім на белым свеце.

Але сэрца маці
Поўніцца трывогай,
Просіць яно ласкі
Для дзяцей у Бога.

Туманом трывога
Засцілае вочы,
І няма спакою
Ані ўдзень, ні ўночы.

Сэрца супакояць
Дарагія словы:
— Не хвалюйся, мама,
Я жывы, здаровы!

* * *

Чаму для мамы вершаў не пішу?
Таму, што слоў патрэбных не хапае,
Каб закрануць пачуццямі душу,
Такімі, што я сэрцам адчуваю.

Яна сям'ю, як сімвал-абярэг,
Жыццём сваім ад бед засцерагае,
І з душаў нашых прыбірае грэх —
Малітваю сваёю ачышчае.

Дык хай жа, Божа, як мага даўжэй
Жыцця зямного сцелецца дарога!
Хай лёс матуляў нашых беражэ,
Бо маміна любоў — любоў ад Бога.

* * *

Шчаслівы той, хто шчасця не шукае
У хуткай плыні бурнага жыцця.
Шчаслівы той, хто тонка адчувае
Законаў строй духоўнага быцця.

Багаты той, каму ўсяго хапае,
Хоць многага не меў усё жыццё.
Багаты — хто чужога не чапае,
Хто дзеліцца найлепшым пачуццём.

Той бессмяротны, хто жыве аддана,
За іншых хто жыцця не шкадаваў.
Той будзе вечна жыць, хто апантана
На ніве ўсенароднай шчыраваў.

Цёплы ўспамін

У прывольнай далі па жыцця дарожках
Бегала дзяцінства на маленькіх ножках,
У дзіцячым ложку спала бесклапотна,
А матулі рукі лашчылі пяшчотна.

Яркае юнацтва пела песні звонка,
Слухала іх шчыра родная старонка.
Першыя пачуцці па вадзе вянкамі
Шчасця-долі сталай для сябе шукалі.

Зараслі-прапалі даўнія дарогі,
Па якіх хадзілі маладыя ногі.
Цёплым успамінам цешыць
памяць сэрца,
Песняю птушынай у душу праб'ецца.

* * *

У кожнага свая калыска —
Свой родны дом, свой мілы край.
У памяці заўсёды блізка
Свая рачулка, ціхі гай,
Маленства чыстага дзянёчкі:
Язмін і бэз — вакол спакой,
У травах кветак сініх вочкі
Мігцелі яснай дабрынёй.
Загадкі, свету спасціжэнне,
Вясёлка ў небе, дождж грыбны
І спелыя суніцы ў жмені…
Навек у памяці яны.

* * *

Мне настальгічныя прыходзяць думы
Пра тое, як змяніўся свет вакол.

Гляджу на ўсё з непрыхаваным сумам,
Кладу на шалі розніцу вякоў.

Сышоў наш час, і даўняе мінула,
Жыццё люблю ўсё роўна, як тады…
Шмат добрага,
што сэрца закранула,
З сабой забралі хуткія гады.

Знаёмай песняй памяць
сэрца сцісне,
Мінулым дням няма назад хады.
Маланкай успамін выразны блісне,
Але наноў не зробіць маладым.

Для кожнага ўспаміны маладосці,
Як жыццядайны сонечны прамень,
Як дарагія, радасныя госці,
Што ў свята ператвораць
просты дзень.

* * *

Насустрач зіме праз туманную восень,
Праз стомлены вечар. А лісцем заносіць
Сляды, што шматкроп'ем
жыццё рассыпае.
І снег ужо белы мяне сустракае
На дрэвах, на дахах, на скронях ссівелых
Надзейных сяброў праз жыццё
пастарэлых,
З сабою нясу страт цяжкіх груз
нязводны,
Набыткаў цудоўных,
душы неабходных…
Іду…

Фота Кастуся Дробава.

У Бабчыне

Майму сябру Мікалаю Мятліцкаму прысвячаю



Віктар ПРАЎДЗІН

Міколу і гэтай ноччу не спалася… Не было сну і ў мінулую ноч, і ў пазамінулую… І, пэўна, бяссонніца была ад той нечаканай цішыні, цішыні незвычайнай, нават аглушальнай у сваёй безвыходнасці… Не супакойвалі ні зорнае неба, ні ўсмешлівы серп-месячык, на які ён у думках яшчэ маленькім спрабаваў накінуць з адзінокіх аблачынак ці то лёгкі капялюшык, ці то зімовую шапку-аблавушку, а то і прыгожую квяцістую хусцінку, якой маці ў непагадзь укрывала свае прыгожыя хвалістыя валасы. Яна абавязкова пакідала вясёлую кудзерку, што выбівалася на лоб з-пад хусткі, і гэтая пасмачка заўсёды ўзнімала ў бацькі настрой. Тады яго строгія, пастаянна заклапочаныя вочы цяплелі, вусны кранала таямнічая і да пары ім, маленькім Міколкам, неразгаданая ўсмешка. Але цяпер не краналі ні неба, ні месяц, ні усхваляванае сэрца, якое трывожна грукала ў грудзях… Яго слязлівая душа больш не спрачалася з думкамі, яна поўнілася болем, пякучым і няўцешным…

Міколу паклікаў Бабчын, і ён прыехаў. Не!.. Не прыехаў, як гэта было заўсёды, а скрытна, абмінаючы міліцэйскія пасты, прабраўся вядомымі з дзяцінства лясными сцежкамі, прадзёрся праз непралазнае кустоўе, і вось яна — родная хата, блізкая сэрцу яго вёска... Яшчэ нядаўна прыгожая і шумлівая, напоўненая бясхмарным шчаслівым жыццём аднавяскоўцаў, начнымі пералівамі гармоніка і дзявочым чыстым смехам, а цяпер адзінокая і сіратлівая. Яна шчымлівым болем смылела ў яго душы і быццам сілілася сказаць яму нешта важнае, сакральнае. Ён адчуваў гэта і чакаў… Чакаў, калі душа Бабчына адгукнецца на цяпер ужо яго покліч і пачне з ім гаварыць…

Не, Мікола не страціў розум, ён адчуваў сэрцам, узрушанай душой, кожнай кропелькай сваёй крыві, кожным сантыметрам цела, што Бабчын жывы, што гэтая сустрэча павінна здарыцца менавіта ноччу, здарыцца, калі ён сам адчуе з ім поўную еднасць… І сведкамі будуць далёкія і блізкія сэрцу зоры і месячык, загадкавы і адначасова бесклапотны. Ім будзе пра каго і пра што гаварыць, разам згадаць былое… Згадаць моўчкі, цяпер ужо як бы без голасу…

Узрадаваўся Мікола, міжвольна, быццам хтосьці настойліва падказаў тэму гаворкі: «Безгалосыя дні»… І раптам да болю шчымлівы гул пчолкі, чамусьці ноччу, уварваўся ў свядомасць:

На полі у кветках атрутнага зла,
Не чуючы ўтомы, шчыруе пчала…

Бабчын, чаму пчала?.. — палілася ў думках нямая гаворка. Я прыйшоў… Я хацеў даведацца:

Чаму я тут ізноў
Між ядзернай аблавы?..

Адказу не было. Нечакана шумліва адазваўся стары клён. Мікола расчыніў акно, і адразу казытлівым водарам напоўніўся пакой. Флёксы некалі садзіла маці і вельмі іх любіла. Калі кветкі зацвіталі, маці клікала сына:

«Зірні Міколка, падзівіся… Гэта ж Божанька стварыў гэткую прыгажосць… І ты дапамог бы маці, прапалоў…»

Міжвольна выкацілася гарачая сляза… Сягоння ён не толькі флёксы, не толькі Бабчын — усю зямлю гатовы прапалоць, каб толькі ачысціць ад стронцыю і ўсялякіх смяротных для чалавека і ўсяго жывога радыенуклідаў… Ігольчатым болем у скронях адгукнулася Міколкава душа, ён прашаптаў:

Хіснецца вецер пругкай сілай —
І зум смяротны на слупах.
Над вёскі ядзернай магілай
Плыве нязвычны флёксаў пах…

На голас з-пад страхі адгукнуліся ластаўкі. Іх шчэбет імгненна нагадаў зусім іншы гук, пісклявы і трывожны:

Цененькі шчэбет.
Дазіметра піск…
……..
Як гэта важка
Слухаць за ўсіх
Ціўканне ваша
Ў сенцах пустых…

Захацелася піць. Колькі мог панесці, столькі вады і прыхапіў, але ж ці надоўга хопіць двухлітровай бутлі? На радасць Міколу, па невядомай, хутчэй, Божай волі, у вёсцы захаваўся толькі адзін калодзеж з чыстай вадой. На ім была прымацавана шыльда: «чысты». Надпіс пазначаны для міліцыянераў, што нясуць патрульную службу, ахоўваюць выселеныя вёскі ад марадзёраў… Месціўся калодзеж у панадворку бацькоўскай хаты. Што гэта?.. Божы промысел?.. Канешне, яго тут чакалі!.. Выйшаў у панадворак, адкрыў вечка студні, пачаў паволі круціць калаўрот, апускаць вядро на ланцугу, а вусны ўжо шапталі:

…Мокры ланцуг… Вядро…
Зноў калаўрот кручу я.
…..
Памяці тры глыткі
З чыстай адзінай студні…

Незаўважна бралася на раніцу… І цішыня… Мёртвая цішыня… На сцяне, як у вязкім тумане, угледзеў фота цёткі, усміхнуўся, паздароўкаўся, сказаў:

Пішу вам, цётка Анюта,
Двор — палын ды быльнёг.
Хата — горам замкнута,
У крапіве парог…

Пахадзіў па пакоі, ціха, са скрухай у голасе, усё яшчэ цётцы, прамовіў:

Памерла ўсё…У часе адышлося.
І толькі неба — небам засталося…

Паглядзеў на гадзіннік, яшчэ даўні, з зязюляй. Ён заводзіў яго кожную раніцу, і зязюля ў адказ, быццам у падзяку, гучна, але зусім не весела, як раней, трывожна кувала праз кожныя паўгадзіны. Чамусьці згадаў учарашні дзень. Прыязджалі патрульныя, напаўнялі калодзежнай вадой армейскія біклагі, металічныя, колеру хакі. Каб не пачулі кування, інакш зловяць, аштрафуюць, напішуць на працу, давялося прыпыніць зязюлю і далей адысці ад акон. У падполле не спускаўся, з пераказаў ведаў, што патрульныя занадта ўніклівыя, калі нешта ці некага шукаюць, абавязкова знойдуць. Служба… Ім не пазайздросціш, радыяцыя нікога не шкадуе…

Зірнуў на бацькавы кірзавыя боты з высокімі халявамі. Абцасы пасля яго «паходаў» па вёсцы засталіся ў ліпучай смале. Боты трохі малаватыя, трэба было добра пастарацца, каб нацягнуць на босую нагу… Цяпер тут без ботаў нельга… У першы вечар выйшаў на двор у гарадскіх бліскучых чаравіках і толькі ступіў з ганка, як адчуў нешта слізкае пад падэшвай… Яму зноў пашэнціла: абцасам прыцісну галаву гадзюкі да цэментавай прыступкі… Не ўкусіла… Цяпер ад падобных нечаканасцей ратуюць высокія халявы…

Далёка ад хат не адыходзіць. Памкнуўся быў у свой хлеў і ўбачыў лысага вожыка… Потым бачыў гэткіх жа, аблыселых, лісіц і янотаў… Па начах стараецца з хаты не выходзіць, цяпер дзікі і ваўкі гаспадараць у Бабчыне.

Сеў да стала, на якім ляжаў добра-такі спісаны агульны сшытак у дзевяноста шэсць старонак, і позірк зноў зачапіўся за смалу на ботах… На паперу ў клетку ляглі радкі:

Чорны асфальт падэшвы пячэ,
Быццам смала пад нагамі цячэ
Чорнага пекла…
…….
Зданямі чорнымі кружаць наўзбоч
Чэрці, павыйшаўшы з чорных балот,
Круцяць на лапы з'іржаўлены дрот,
Гойстрыя шчэраць у хмызе клыкі,
П'юць — не натоляцца з чорнай ракі.
…
Дробна капытамі б'юць па зямлі.
Тут не адзін ужо ядзерны год.
…
Ведаю: недзе на дне
Вочы сузор'яў бачаць мяне —
Жарка палае ў цямрэчы касцёр,
Уголас выносіцца мне прыгавор…
Хто яго шэпча — Д'ябал ці Бог?
Ношу жывога жыцця не ўбярог.
Як жа, хадок, упусціў ты з плячэй
Ношу сваю? Перапудзіў чарцей.
Боўтнула ў чорную рэчку
На дно,
Легла жывая,
І ўжо не відно,
Дзе беззваротна у іле лягла…
Булькае чорная ў рэчцы смала…

Перачытаў, адчуў незакончанасць думкі… Няўжо і ён, і іншыя простыя людзі вінаватыя ў тым, што здарылася? Няўжо гэткая нялюдская бяда будзе заўсёды побач? Няўжо:

Памерла ўсё… У часе адышлося.
І толькі неба — небам засталося?..

Няўжо мая зямля назаўсёды, на вякі застанецца **«адпетая бядой»** і… **«зонаю бяды…».**

Закружыла, закружыла чараўніца зіма!

Замалёўкі

Ірына САЛАТА

Ідзе снег

Зіма. Вечар. На вуліцы ідзе снег. Сняжынкі зазіраюць у акно, ліпнуць на шыбу, хутка ператвараюцца ў кроплі вады і звілістымі дарожкамі паўзуць уніз. Яны нагадваюць цёплы летні дождж. Што можа быць лепшае за дождж у спякотны дзень?!

А за акном лётаюць-кружацца сняжынкі. На прастору з вокнаў выраваецца святло. Сняжынкі адна перад адной у гэтым святле танцуюць. І не вызначыць, якая з іх лепшая танцорка. Яны віруюць, носяцца ў прасторы, абганяюць адна адну, а потым зіхоткімі блішчынкамі падаюць на зямлю. А на зямлі — бялюткі неруш. Шчымлівая прыгажосць набывае ўзнёслыя крылы і кранальнымі, непаўторнымі абрысамі поўніць наваколле. Галіны дрэў быццам цукровай ватай ухутаны. А туя апранула белы кажушок, надзела пухнатую шапачку. Сапраўдная мадэль!

Лётаюць-кружацца сняжынкі. Яны ўсё настойлівей стукаюць у шыбу, нібы просяцца ў цёплы пакой. Адкрываю акно. Пакой адразу напаўняецца свежым вільготным паветрам, а сняжынкі халоднымі пацалункамі дакранаюцца да твару. Новае пачуццё! Падалося, што гэта нешта добрае і дзіўнае варожыць нада мною.

Сцежка ўспамінаў

Стаяць ціхія марозныя дні. Вецер, што час ад часу дзьме холадам, бударажыць свежае паветра, чапляецца за голле, трывожыць застылую нерухомасць. Вострыя крышталікі зрываюцца са снежнага ўбрання дрэў і сыпучым зззяннем падаюць на зямлю, дзе паўсюль вялікія сумёты. Рабрыстыя ўзгоркі, нібы мора, якое пеніцца срэбнымі бліскучымі хвалямі. Усюды — вялікія гурбы снегу. Яны праглынулі нізіны, схавалі пад тоўстым пластом усё на сваім шляху. Не відаць ні малых сцяжынак, ні вялікіх дарог. Навокал пануе асляпляльная чысціня. Неабдымная бялюткая прыгажосць! Сэрца напаўняецца радасцю. Кроў пачынае струменіць у жылах. Цела наліваецца цёплымі пачуццямі, якія пераносяць мяне па сцяжыне ўспамінаў у далёкія гады маленства. А там мы, вясковая дзятва, радаваліся зіме, беламу снегу і добраму марозу. У ход ішлі санкі, лыжы і самаробныя канькі. Нашы бацькі налаўчыліся іх рабіць з невялікіх дошчачак, да якіх прымацоўвалі тоўсты дрот. І што вы думаеце!? Прывязаныя на валёнкі «канькі» ехалі па лёдзе. І тая радасць, якая агортвала тады, і сёння ўспамінаецца з вялікім замілаваннем. Мы ішлі на паплавы. Апантана гулялі ў хакей. Дзяўчынкі поруч з хлопчыкамі вучыліся забіваць шайбы ў вароты. І гэта ў іх нядрэнна атрымлівалася. Дадому вярталіся ўжо апоўначы, калі зоркі на небе пачыналі сваё міргатлівае шэсце. І кожны з нас назаўжды захапіў з сабою, захаваў у душы маленькую зорачку, якая не гасне і сёння.

На вуліцы зіма. Мароз. Гурбы снегу. Адольваюць успаміны. Мілыя ўспаміны дзяцінства! Так хочацца, каб яны паўтарыліся зноў, каб шчымлівыя пачуцці той далёкай пары сталі яваю.

Сваяцтва і ў любові да Бацькаўшчыны

Што яны сваякі — ведаюць многія. Праўда, чытачы больш маладога ўзросту — далёка не ўсё. Язэп Лёсік — родны дзядзька народнага песняра Беларусі Якуба Коласа. Маці яго Ганна, у дзявоцтве Лёсік, з'яўлялася Кастуся Міхайлавіча сястрой. Пляменнік быў на два гады старэй за дзядзьку. Якуб Колас — агульна вядома — нарадзіўся 3 лістапада 1882 года. Калі па новым стылі. Язэп Лёсік упершыню зірнуў на свет 6 лістапада 1884-га. Часам сцвярджаецца, што гэта адбылося 18 лістапада.

Язэп Лёсік.

З няволі да лепшай долі

З маленства Язэпка любіў чытаць кніжкі. У чатырнаццацігадовым узросце падаўся ў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, але не паступіў. Выкладчыкам не падабаўся нядаўні выпускнік свайго брата Антона за беларускасць. Аднак у семінарыю экзамен усё ж здаў, толькі ў Маладзечанскую. Праўда, правучыўся толькі год. Таксама прыйшоўся не даспадобы. Паехаў у горад Ноўгарад-Северск, дзе настаўнічаў брат. Дзякуючы яму паступіў у апошні клас тамашняга гарадскога вучылішча, якое скончыў у 1902 годзе. Здаў і экзамен пры Ноўгарад-Северскай гімназіі. Атрымаў званне настаўніка народнай школы і хатняга настаўніка пачатковай.

Год настаўнічаў у Бабруйскай сельскагаспадарчай школе, а пасля вярнуўся да брата. Уладкаваўся ў мястэчку Грамяч у Ноўгарад-Северскім павеце. 19 снежня (па ст. ст.) 1905 года трапіў пад нагляд паліцыі, апынуўся ў Ноўгарад-Северскай турме. Быў пераведзены ў мястэчка Старадуб, адкуль уцёк. Некаторы час хаваўся ў знаёмых у Стоўбцах, жыў і ў Мікалаеўшчыне. Настаўніцкі з'езд у Мікалаеўшчыне і ідэя Беларускага вучыцельскага хаўрусу — шмат у чым яго ініцыятыва.

Калі даведаўся, што паліцыя выйшла на след, падаўся ў Пецярбург. Хоць, па пэўных звестках, некаторы час хаваўся ў сваякоў і знаёмых у Стоўбцах. Са сталіцы паехаў да свайго старэйшага брата Міхася — начальніка чыгуначнай станцыі Красноўка каля горада Луганска. Чым кіраваўся, невядома, але хутка зноў апынуўся ў Ноўгарад-Северскім. Быў арыштаваны і адпраўлены ва ўжо добра вядомую яму Старадубскую турму. 15 сакавіка 1908 года суд пастанавіў накіраваць у вечную высылку ў Сібір. У ліпені даставілі ў Іркуцкую губерню, а ў самым канцы гэтага месяца — у сяло Караткоўскае Мартынаўскай воласці Кірэнскага павета.

Згаджаліся зняволеныя на любую работу, «абы не памерці з голаду». Не кожнаму было ў што абуцца ці апрануцца: «На дварэ сібірская сцюжа, а тут не дзіва спаткаць на вуліцы "палітыка" ў адным "кулёчку"». Кулёчак — гэта пінжак з даматканага матэрыялу. Са скрухай пісаў і аб тым, што «да гэтага яшчэ прылучаецца нуда па роднай старане. Сэрца заходзіцца ад жалю, што, можа, ніколі не давядзецца хадзіць па родных сцежках, ніколі не пачуць тых мілых песень, якія сам спяваў з маленства». Шэсць гадоў правёў у суровых краях. У Мінск прыехаў пасля Лютаўскай рэвалюцыі.

Пераклаў «Маніфест Камуністычнай партыі»

Займаўся рэдакцыйнай дзейнасцю. Дзякуючы яму былі апублікаваны ўрыўкі з «Сымона-музыкі» і «Новай зямлі» Якуба Коласа, яго п'еса «Антон Лата», некаторыя вершы і апавяданні, а таксама паэма Цішкі Гартнага «Капыль», творы Максіма Гарэцкага, Змітрака Бядулі, Алеся Гаруна, Каруся Каганца, Фабіяна Шантыра і іншых. Сам выступаў з публіцыстычнымі артыкуламі і краязнаўча-гістарычнымі нарысамі. Узнімаў пытанні нацыянальнага адраджэння. Усё больш і настойлівей праводзіў думку аб далучэнні да набыткаў культуры простага народа.

Пасля вызвалення Мінска ад белапалякаў афіцыйна прызнаўся ў вернасці савецкай уладзе, выказваў жаданне працаваць на карысць Беларусі, яе росквіту, шчаслівай будучыні. На гэта рашыўся свядома. Ідэі роўнасці, братэрства, незалежнасці, якія дэкларавалі камуністы, заўсёды падтрымліваў. Таму і пераклаў на беларускую мову «Маніфест Камуністычнай партыі». Адначасова ў артыкулах хацеў суаднесці дзень учарашні з сённяшнім, каб высветліць, што ўжо зроблена, а што яшчэ трэба.

Гэтымі думкамі прасякнута даследаванне «Культурны стан Беларусі к моманту Лютаўскае рэвалюцыі», што ўвайшло ў зборнік «Беларусь», які склалі Алесь Сташэўскі, Зміцер Жылуновіч (Цішка Гартны) і Усевалад Ігнатоўскі. Згаданай публікацыяй засведчыў аб сабе як аб навукоўцу, які адным з першых на Беларусі, уважліва прыглядаючыся да нядаўняга мінулага Бацькаўшчыны, узяўся за асэнсаванне таго, як і чым жылі беларусы. Закрануў розныя аспекты, што ўжо відаць па назвах частак гэтага грунтоўнага даследавання: «Грамадзянскі склад Беларусі», «Быт, права, звычаі», «Асвета», «Цэркаў і рэлігія», «Навука і мастацтва».

Праявіў сябе глыбока эрудзіраваным даследчыкам. Важна і тое, што па меры неабходнасці ўдакладняў некаторыя свае ранейшыя меркаванні. У прыватнасці, адносна рэвалюцыйных змен у жыцці грамадства. Прызнаваў нараджэнне «ідэі нацыянальнага адраджэння […] яшчэ ў пачатку XIX стагоддзя, у рэзультаце таго навуковага руху, што распачаўся пры Віленскім універсітэце». Аднак прызнаваў, што «гэта была толькі ідэя — прычым кволая і зусім невыразная». Разам з тым зазначаў, што «сапраўдны беларускі рэнесанс распачаўся толькі напярэдадні Лютаўскае рэвалюцыі 1917 года і стаў навочнай рэальнасцю пасля перавароту ў кастрычніку […]». Пазітыўныя змены ў грамадстве яго ўзрадавалі.

Свечка, што не павінна згасаць

Пасля адкрыцця ў 1921 годзе Беларускага дзяржаўнага універсітэта пачаў выкладаць у ім беларускую мову. Прыклад яго перанялі Янка Купала, Якуб Колас, Максім Гарэцкі... Яны займаліся не толькі са студэнтамі, але і з выкладчыкамі, хто, не ведаючы мовы, хацеў авалодаць ёю. Шмат у гэтым спрыяў і кабінет беларускай мовы. Да работы яго асабліва шмат спрычыніўся. Неабходныя кніжкі і навучальныя дапаможнікі выдзеліла Дзяржаўная бібліятэка Беларусі.

Праз год прапанаваў тагачаснаму наркаму асветы БССР Усеваладу Ігнатоўскаму арганізаваць вышэйшыя курсы беларусазнаўства. У тым жа 1922 годзе адбыўся і першы выпуск. Выступаючы на ім, не хаваў радасці: «Вы ўжо не тыя, што былі, бо пакаштавалі плоду з таго дрэва, што называецца беларускай справай, беларускім Адраджэннем, пазналі таямніцы ўваскрашэння Айчыны нашай — маці-Беларусі. Вашы свечкі запалены, і вы становіцеся апосталамі беларускай справы. Вы скажыце народу беларускаму, што Беларусь жыла, жыве і будзе жыць… Але бойцеся, каб не пагасла свечка ваша, бо не раз бура захопіць вас у дарозе і не адну навальніцу давядзецца перажыць вам у часе свайго падарожжа. Пільнуйцеся і бойцеся, каб не пагасла свечка замілавання вашага да сваёй многапакутнай маці-Беларусі. Пільна сачыце за сабой і не забывайце падліваць алею ў свяцільны вашы, каб было з чым сустрэць яе, Беларусь, калі яна прыйдзе судзіць нас ва ўсёй славе сваёй».

Адна за адной выходзілі яго навуковыя працы: «Беларускі правапіс», «Школьная граматыка беларускай мовы», «Сінтаксіс беларускай мовы», «Граматыка беларускай мовы: фанетыка», «Граматыка беларускай мовы: марфалогія», «Практычная граматыка беларускай мовы»… Аргументавана даводзіў, што беларуская мова — адна з найпрыгажэйшых і ставіцца да яе неабходна з павагай. Вялікую ўвагу надаваў розным аспектам мовазнаўства, змагаўся супраць празмернага запазычання чужых слоў. На першым плане ў яго была чысціня роднай мовы. Пра гэта рупіўся, калі працаваў у секцыі беларускай мовы і літаратуры Інстытута беларускай культуры, куды яго запрасіў Усевалад Ігнатоўскі.

«Не ўсе ж разам, ягамосці!..»

Пакінуў аб сабе след і як пісьменнік. Як і многія літаратары, пачынаў з паэзіі. Вершаваныя радкі ёсць і ў яго «Апавяданні без назвы», на завяршэнні раздзела «Гаронім-ляснік». Літаратарам яго, аднак, зрабіла не паэзія. Цікавым і самабытным пісьменнікам стаў дзякуючы прозе. Хоць не так і шмат напісаў, але гэта хораша аздабляе нацыянальнае прыгожае пісьменства. Пачынаючы з першага апавядання «Рабы Міхась Крэчка, што быў за суддзю», апублікаванага яшчэ ў 1912 годзе.

Тое, што адбылося з простым селянінам, якога выбралі суддзёй, як «падказвае» падзагаловак «Маленькая гісторыя памяці Гіполіка Малчановіча з Івянца», хутчэй за ўсё, было ў сапраўднасці, і расказана пра гэта дасціпна і ярка. За жартаўлівасцю бачыцца і тое сур'ёзнае, што дазваляе лепш адчуць (і зразумець!) аднаго з прадстаўнікоў народа, які нічым асабліва не вызначаецца. Але гэта пра іх кажуць: палец у рот не кладзі.

Па вартасцях апавяданне «Рабы Міхась Крэчка…» ацаніў Максім Багдановіч. У кастрычніку 1912 года пераклаў яго на ўкраінскую мову, каб разам з творамі Сяргея Палуяна, Тараса Гушчы (Якуба Коласа), Францішка Багушэвіча, Алеся Гаруна і іншых беларускіх пісьменнікаў уключыць у кнігу, што мелася выйсці ў Кіеве. Аднак пра тое, як склаўся лёс гэтага зборніка, невядома.

Больш шчаслівым аказаўся лёс апавядання «Не ўсе ж разам, ягамосці!..», у аснове якога таксама камічная сітуацыя. Гэтым разам звязаная з папугаем, які пацяшаў наведвальнікаў крамы. Сюжэт Язэп Юр'евіч узяў з мікалаеўшчынскай рэчаіснасці. Раскрываючы ўнутраны свет сваіх персанажаў, праўдзіва ўзнімае і пэўны пласт народнага жыцця. А яшчэ належыць да тых, хто стаяў каля вытокаў беларускай гумарыстычна-сатырычнай прозы. Адно завяршэнне твора чаго варта!? Папугай, скарыстаўшыся тым, што гаспадар забыўся зачыніць знадворку дзверы карчмы, вырваўся на волю. На яго накінуліся вераб'і. З крыжа, на якім сядзеў, бедалага зваліўся на зямлю, а яны «дзяўблі зверху па галаве, як кавалі малаткамі па кавадле. […] Папугай саўсім змогся, аслаб: ён ужо не бараніўся, не асякаўся, а толькі як з плачам крычаў:

— Не ўсе ж разам, ягамосьці! Трымайся чаргі, калі ласка!»

Падвяла… будучыня

У 1914 годзе з друкарні Максіма Кухты выйшла кніжка Язэпа Лёсіка «Не ўсе ж разам, ягамосьці», змест якой і склала гэтае апавяданне. Шкада, але пры жыцці асобным выданнем яго творы больш не выходзілі, хоць і жыў новымі задумамі. Каб больш пісаць прозы, усё часцей адкладваў працу над чарговымі артыкуламі. З'явілася казка «Геркулес і селянін», «Апавяданне без канца», «Па-валачобнаму», іншыя творы. Ды толькі жыццёвы лёс для яго аказаўся няўдзячны: не стала Язэпа Юр'евіча 1 красавіка 1940 года.

Максім Гарэцкі, які адным з першых пазнаёміўся з апавяданнямі Лёсіка, не хаваў свайго захаплення: «Гэтага слаўнага пісьменніка чакае яшчэ слаўнейшая будучыня». Хто ведае, магчыма, з цягам часу і атрымаўся б з Язэпа Лёсіка яшчэ больш цікавы, самабытны празаік, калі б не яго навукова-педагагічныя намаганні. «Закінуўшы пісанне мастацкіх рэчаў, перадаўся на публіцыстычна-педагагічную працу», — заявіў неўзабаве Цішка Гартны, перад гэтым, аднак, адзначыўшы: «Язэп Лёсік, вызначыўшыся як здольны белетрыст ("Не ўсё ж разам, ягамосьці!.." і інш.), абяцаў многае».

Ухвальнае слова пра творчасць Язэпа Лёсіка сказаў Максім Гарэцкі. У «Гісторыі беларускае літаратуры» (1920) ён даў яму такую ацэнку: «Лёсік дужа **таленавіты апавядальнік** (выдзелена М. Г. — **А. М.**) і напісаў выдатную ў нашай эпічнай паэзіі рэч "Апавяданне без назвы". Асабліва ўдаецца яму маляваць беларускіх дзетак (Анцік, Юзік). Творчасць Лёсіка вельмі нацыянальная, народна-беларуская. Нейкі захаваны надлом сваёй душы паказаў ён у вядомым "Не ўсе ж разам, ягамосці!.."» Да створанага ім як апавядальнікам Максім Гарэцкі звяртаўся і ў адным са сваіх артыкулаў.

* * *

Якуб Колас і Язэп Лёсік — сваякі не толькі па крыві. Ёсць у іх і сваяцтва асаблівага роду. Яно аб'ядноўвае іх у любові да зямлі беларускай, да роднай Беларусі. Безумоўна, унёсак кожнага ў творчасць і ў асэнсаванне шляхоў далейшага развіцця Айчыны розніцца. Кажучы словамі яшчэ аднаго класіка, у гэтым сэнсе «Бог не роўна дзеле». У аднаго набыткі большыя, у другога — меншыя. Толькі аб'ядноўвае тое, што вылілася ў класічны радкі Якуба Коласа: «Мой родны кут, як ты мне мілы!». То не будзем забываць гэтых двух слаўных сыноў Бацькаўшчыны. Памятаючы іх, станем успрымаць іх не толькі выдатнымі творцамі, але і свайго роду настаўнікамі на шляхах лепшага пазнання краіны, у якой мы жывём і ў якой, несумненна, будуць жыць нашы нашчадкі.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

«Нас толькі двое...»

Максім і Жэня… Калі ўжо, здаецца, напісалася рабочая назва гэтага матэрыялу з двух імёнаў, падумалася: занадта проста і не зусім адпаведна рэчаіснасці. Свайго мужа Аляксандра Каратая, вядомага пад псеўданімам Максім Лужанін (1909—2001), Яўгенія Пфляўмбаўм (1908—1996) называла Алесем. Але ў напісаным убачылася своеасаблівая сімвалічнасць, несвядомая далучанасць да сучасных інтэрпрэтацый вакол гэтага неардынарнага творчага сужэнства.

Паэт — заўсёды загадка, а ў выпадку з Лужаніным і Пфляўмбаўм жыццёва-творчых таямніц і пытанняў назбіраецца з нязменным памнажэннем на два. Побач з міфалагізаванымі ўяўленнямі і вольнымі меркаваннямі ёсць магчымасць прадставіць сямейную гісторыю, грунтуючыся на архіўных матэрыялах. Адзін з важкіх фактаалагічных крокаў у гэтым напрамку быў зроблены, калі ў часопісе «Нёман» (2011, №№ 6—7) пабачыла свет перапіска М. Лужаніна і Я. Пфляўмбаўм 1930—1946 гг. у перакладзе на рускую мову Таццяны Куварынай. У прадмове Марына Ліс, супрацоўніца Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі, распавяла гісторыю фарміравання персанальнага фонду № 17 (2577 адзінак захавання), сумесную працу з патрыярхам беларускай літаратуры.

Максім Лужанін, 1930 г.

Сёння ў стадыі апрацоўкі знаходзяцца дзённікі Максіма Лужаніна, у якіх сучаснасць пераплятаецца з мінуўшчынай. Аўтар гэтых радкоў звярнуўся да асвятлення ў іх найбольш складанага перыяду жыцця — перадваенныя і першыя ваенныя гады, калі дзве яркія асобы праходзілі этап прабавання сваіх пачуццяў, разрыву і сямейнага ўз'яднання.

Вядома, творчае маўчанне Яўгеніі Пфляўмбаўм доўжылася шмат дзесяцігоддзяў. На розных экзэмплярах урэшце прычаканай кнігі «Сувой жыцця» (Мінск, 1989) паэтэса пакінула дарчыя надпісы, адрасаваныя мужу: «Алесю Каратаю. Табе з падзякаю за вызваленне радкоў»; «На добрае ці на благое — нас толькі двое… Жэня».

Звернемся і мы да «вызваленых» старонак дзённікавых і мемуарных запісаў Максіма Лужаніна.

* * *

7 ліпеня 1997 г. <…> Зайшла Л. Рублеўская… Яна аж здрыганулася, пачуўшы, што ў Маскве некаторы час мы з Яўгеніяй Эргардаўнай жылі асобна, і ў мяне нарадзілася дачка не ад яе. Няма чаго рабіць з гэтага нейкую таямніцу, веданне біяграфіі дапамагае высветліць прычыны смуткаў, цяжкіх настрояў, скаргаў у паветра ў кнігах Жэні. Дарэчы, яна па-матчынаму ставілася да беднай маёй Алёнкі. Вырашыўшы перамагчы ў сабе паэтку, яна хацела мець дзіця, сталы дах і ўтулак. Ні таго, ні другога, ні трэцяга не было, бадзяліся па кутах у Маскве, не маючы права ўзяць гаспадарскую кнігу з паліцы, пераставіць стол ці крэсла. А галоўнае — няўпэўненасць: сёння жывеш, заўтра папросяць выбірацца, а на аплату таго жытла ішла большая палавіна нашых, далёка не тлустых заробкаў. За няпоўныя два гады мы змянілі безліч такіх прыпірышчаў: Кадашоўская набярэжная, Кіслаўскі завулак, Малая Пірагоўская, нарэшце, Плюшчава (пасёлак, куды хадзіла электрычка) у недабудаваным доме ВАСХНІЛ, дзе лілася з радыятараў вада, свістаў вецер у дрэнна пашклёныя шыбы. Як убіліся туды? Праз выдавецтва ВАСХНІЛ, дзе працавала Жэня. І гэта было шчасце! Асобны пакой, стол, два ложкі. Я купіў гаечны ключ, падцягнуў гайкі ў батарэях, пара кіло замазкі ўцяпліла вокны. Стала прыстойна, да нас нават прыязджалі госці: Янка Бобрык, Юлі Таўбін, Сяргей Дарожны. А Зіна Бандарына жыла з месяц, праўда, спала на нейкім мяху каля акна.

Невыгоды батавання лёгка касаваліся. Няхай сабе гарлаюць у суседнім пакоі ўлюбёны ўсімі п'янымі «Камыш». Няхай сабе дзьме ў скалочанай з апалкаў прыбіральні з выпісанымі на дзвярах дакорамі некаму з жыхароў: «Пазор дяди Хвосту, у яво дзевки бальшыя, сматреть надо», «Катерина, Катерина, тибе надобна… дубина! Зачим вчерась ходила в Перово?». І другім почыркам: «Она не была в Пирови. Она с Ванем в кустах лежала». Некалі я спісваў гэта ганьбаванне Хвасту і Кацярыне, лісток згубіўся, дый ці варта ўсё ўспамінаць.

Дзіця Жэня хацела мець даўно. Ды не ў Сібіры было гадаваць яго. І не пад нашымі часовымі дахамі. У Плюшчаве гэта прага адрадзілася востра. А на з'яўленне дзіцяці нішто не паказвала. Кінуліся правярацца ў дактароў: няма адхіленняў ні ў таго, ні ў другога.

Пачалася нервознасць. Дактары: чаму ты так позна прыйшоў (прыйшла), дзе быў (была)? Да сварак даходзіла, да слёз. З абодвух бакоў. Плакаў і я, выходзіў у калідор, хаваўся, або хадзіў наўкруга дома, высушваючы вочы. Дый нашто цяпер таіцца перад сабою, скажам уголас: блізка была электрычка — спакушалі рэйкі.

Вясною 1938 папярэдзілі — выязджаць і з гэтага апошняга лагва. З тою навінаю яна паехала на май да бацькоў. Хлапчук-пасыльны прынёс ёй у вагон, на пэўнае месца, букет гартэнзій. «Прыгожыя кветкі?» — спыталася. Я адчуваў: калі нехта ведаў вагон і месца, значыць, былі спатканні, усё расказала пра ад'езд.

Праз дзень ці два паехаў у Мінск і я. Да бацькоў яе не зайшоў, спыніўся ў знаёмых, з імі і святкаваў. На ад'ездзе наведаўся да яе, маці сустрэла як чужога, самóе ў хаце не было.

Як на тое, вярталіся ў Маскву ў адным вагоне, пустым. Селі ў адно купэ і, слова за слова, пасварыліся моцна: быў успамянуты той букет кветак і яшчэ дробязі, якія і ёй, і мне здаваліся тады нясцерпнымі. Хто першы надумаўся кінуць: «давай разыходзіцца», не помню.

Пад'язджаючы пад Маскву, я вырашыў: так і трэба рабіць. Бушавала хваля змагання з «ворагамі», саджалі другім паваротам: Юлі і Змітрок ужо зніклі. Нічыпар Чарнушэвіч, чакаючы электрычкі на вакзале, шапянуў, што сушыць сухары. Чым жа я лепшы? Забяруць, а што з ёю? Ехаць услед за мной, як у 1933? Не, забяруць самую і таксама кінуць у лагер — былі ўжо весткі, што чыняць расправы з сем'ямі. А так не зачэпяць, яна будзе паасобку.

Яўгенія Пфляўмбаўм, 1926 г.

Узважыўшы доказы *«pro i contra»*, я пацвердзіў згоду на разыходжанне. Яна збялела, махнула хустачкай на твар і аднымі вуснамі прашаптала: «Хай так!»

Пад стары дах мы ўжо не вярнуліся, начавалі ў знаёмых, я — на Зацэпе, яна — на Трубнай, у стрыечнай сястры.

Было і яшчэ адно меркаванне, не выказанае ўголас, але, відаць, турбавала яно не толькі мяне. А, можа, у яе створыцца сям'я, будзе дом, адданы чалавек — нішто і з твару, і з постаці, і з пасады? Магчыма, і дзіцёнка бусел прынясе? Бывае ж, памыляюцца дактары, і ў адсутнасці дзіцяці вінны выпадковасці.

Першыя дні па расстанні, і <*нечытэльна*> ляжаць каменем на плячах. Пошукі жытла забралі ўвесь вольны ад работы час: раз'езды па Маскве і ў ваколіцах. Ездзіў з Беларускага вакзала ледзь не ў канец прыгараднага маршруту, дзе ў сляпой і халоднай хаціне туліўся ледзь не да апошніх дзён сваіх яе айчым. Не атрымлівалася нічога: ці «самім цесна», ці «выпусцілі ўжо налета».

Нарэшце выдавецкі супрацоўнік нараіў прыстойны пакойчык, амаль у цэнтры, праўда шумнаваты крыху, затое выпускалі яго аж на два гады. Я схапіўся за перавоз і перанос параскіданых па ўсіх сваіх прытулках рэчаў, тоячы затлелую ў душы надзею: а можа, прыйдзе яна, зірне і ўсё будзе так, як і раней.

Прыбраўся, уладзіўся, надзеў лепшанькую сарочку і пінджачок і пазваніў, запрасіў глянуць. Яна прыйшла таго ж вечара, упадабала, пакаштавала глыток ікему ў аплеценай саломкаю бутэльцы. Пасядзела з паўгадзіны, сабралася адыходзіць, вярнулася, пацалавала мяне ў лоб і з сумнаватай усмешкай зачыніла за сабой дзверы…

Той самы рытуал быў прароблены, калі яна атрымала пакой (праз сваё ўплывовае выдавецтва), былі і ўлазіны, была яе маці, быў той жа развітальны пацалунак у лоб.

Мы не гублялі адно аднаго з вока. Званілі з работы, я прыносіў ёй лекі, калі хварэла, выконваў дробныя даручэнні для айчыма і маці.

Адыходзячы на прызвы 3/VIII.41, перавёз да яе кнігі і ацалелыя ад пераўрусу ў Мінску рукапісы — іх захавалі бацькі. Калі ж пераступіў яе парог улетку 1942, прыехаўшы з Іванава атрымліваць прызначэнне у МЦА, адчыніла дзверы, спляснула рукамі і са слязьмі абняла за шыю.

Такім чынам пачалося ізноў усё спачатку.

Лісты яе пад Сталінград і ў шпіталь захоўваў, чытаў кожную вольную хвіліну і адчуваў, наколькі лягчэй трываць бамбёжкі, артналётны, свіст выпадковых куль над вухам — яна падтрымлівала мяне за руку, не давала знікнуць пад зямлёю.

Як ні шкада, з лістоў тых застаўся толькі адзін, на адвароце якога мае сябры па шпіталі паведамілі ёй аб маёй выпісцы, назваўшы яе «Еўдакія».

Што ў датах і абставінах нашага разрыву не памыляюся, ёсць сведчанні. Зусім нядаўна расшукаў у чарнавіках два лісты: адзін — не хачу брудзіць паперы іменем, вярнуся пазней, другі — ад маці (рукой айчыма). З ліста маці чуваць, што нялёгка было дачцэ ў першыя дні нашага жыцця паасобку. Напісала і папрасіла, каб маці прыехала, а той, відаць, нязручна было, бо выказала жаданне прыехаць пазней, хоць і турбавалася: «как ты там одна устроилась». Мінскі ліст напісаны і адасланы 17.V.38, і, мусібыць, ёсць адказам на яе ліст з Масквы, дзе расказвалася аб тым, што ў нас адбылося.

Не ведаю, ці прыязджала маці тады, але неўзабаве яны з айчымам перабраліся бліжэй да дачкі: айчым спачатку настаўнічаў у Істры, а калі яе захапілі немцы, — у падмаскоўным Давыдкаве, дзе добрыя дзяўчаты з зенітнага батальёна прыносілі «настаўніку» цэлую балею поліўкі, успомніў і цяпер стала смачна, як тады. Разам з Ж. пахавалі на Ваганькавых могілках, спачатку маці, а пасля і старога. Я наведваў яго ў бальніцы на Пірагоўскай, ледзь пазнаў, саслаб вельмі і быў як быццам не ў сабе.

Маці нібы ў ваду глядзела («как ты там одна»), ні ў адным кутку, дзе Ж. даводзілася туліцца, колькі ні заходзіў куды, не знаходзілася і следу чые-небудзь прысутнасці. Ні даху свайго не атрымалася, ні дзіцяці, ні добрага чалавека поруч.

Недзе ў накідах яе вершаў на рускай мове знайшоў недакончаныя радкі:

Набирал он высоту
На мечту.
Хоть и был он у высот,
Да не тот.



Кніга паэзіі «Сувой жыцця» (1989) з дарчым надпісам аўтара, адрасаваным Алесю Каратаю (Максіму Лужаніну).

Мікола ТРУС,
кандыдат філалагічных навук
Ілюстрацыі з фондаў
ЦНБ НАН Беларусі

Крокі наперад

На мінулым тыдні камерная зала Вялікага тэатра Беларусі поўнілася шматлікімі гасцямі. Нагода не была звязана са светам музыкі. Пляцоўка выбрана для ўрачыстага мерапрыемства — святкавання 85-годдзя Беларускага саюза мастакоў. Гучалі словы падзякі, уручылі ўзнагароды творцам, якія плённа працавалі на карысць развіцця айчыннага мастацтва. Хоць без музыкі і спеваў не абышлося — віншавалі мастакоў артысты Вялікага тэатра: народная артыстка Анастасія Масквіна, брас-квінтэт *A.M.A.D.I.S. Brass*, спевакі Аляксандр Гелах, Аляксандр Міхнюк, Дар'я Гаражанка і Андрэй Мацюшонак.

Спачатку мастакоўскую супольнасць павіншаваў са святам першы намеснік міністра культуры Валерый Грамада. Ён нагадаў пра значную ролю арганізацыі ў культурным жыцці краіны і пажадаў членам Беларускага саюза мастакоў бясконцага творчага натхнення. «Саюз аб'ядноўвае больш за тысячу чалавек. Сярод іх — народныя мастакі Беларусі, заслужаныя дзеячы мастацтваў, лаўрэаты Дзяржаўнай прэміі, прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. І, безумоўна, саюз — адна з самых буйных, самых уплывовых творчых арганізацый нашай краіны. А вынік яго працы — гэта маштабныя міжнародныя і рэспубліканскія конкурсы, пленэры, гэта творы, якія сёння ўпрыгожваюць нашы гарады, інтэр'еры грамадскіх будынкаў, выставачныя залы нашых музеяў», — адзначыў Валерый Іванавіч. Асаблівая ўдзячнасць ад Міністэрства культуры — найлепшым аўтарам. Валерый Грамада ўручыў узнагароды Івану Міско, Уладзіміру Уроднічу, Мікалаю Апіёку, Віктару Барабанцаву, Ларысе Журавовіч і Аляксандру Дранцу.

Першы намеснік міністра таксама зачытаў віншавальны ліст ад старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай. «Увесь гэты час саюз выконвае важную місію па стварэнні і захаванні нацыянальных мастацкіх каштоўнасцей, пошуку і падтрымцы маладых талентаў, садзейнічае развіццю, прапагандзе і рэалізацыі ўсіх відаў і жанраў беларускага выяўленчага мастацтва. Дзякуючы намаганням многіх пакаленняў удзельнікаў аб'яднання на свет з'явілася шмат цудоўных твораў, якія перадаюць непаўторную прыгажосць Беларусі, яе гістарычную і духоўную спадчыну. Саюз аб'ядноўвае пад сваім крылом таленавітых і неабыякавых людзей, усім сэрцам адданых роднай зямлі», — адзначыла ў віншаванні Наталля Качанава.

Прагучала таксама віншаванне ад Веніяміна, Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі. Цёплыя словы ў адрас кіраўніцтва і творцаў Беларускага саюза мастакоў прагучалі ад прадстаўнікоў Беларускага прафесійнага саюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму і ўпраўлення культуры Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта. Саветнік па культуры Пасольства Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь спадар Ся Гуань Юань адзначыў уклад творчай суполкі ў развіццё культурнага супрацоўніцтва паміж краінамі: «За 85 гадоў Саюз мастакоў ніколі не перарываў сувязь з кітайскай культурай. Асабліва апошнія гады кантакты становяцца больш цеснымі».

Напрыканцы ўрачыстай цырымоніі слова ўзяў старшыня БСМ Глеб Отчык:

Фота з сайта sb.by

Іван Міско і Глеб Отчык.

— Сёння мы падводзім вынікі нашай дзейнасці, якая абапіраецца на магутны падмурак — нашых народных мастакоў. І мы працягваем рабіць сур'ёзныя крокі наперад. За чатыры гады Беларускі саюз мастакоў павялічыў выставачную дзейнасць у тры разы, нягледзячы на пандэмію. У нас падпісана 12 пагадненняў аб супрацоўніцтве з Кітайскай Народнай Рэспублікай, плануюцца выезды ў Башкартастан і Татарстан, шырока ахопліваем тэрыторыю ад Ніжняга Ноўгарада да глыбінак. Праектаў вельмі шмат!

Дарэчы, у фае Вялікага тэатра прадстаўлена святочная выстаўка «85 гадоў разам». Дэманструецца жывапіс мастакоў — сяброў творчага саюза розных гадоў стварэння з фондаў БСМ. Пейзажы, нацюрморты належаць пэндзлям Мацвея Беляніцкага, Вячаслава Кубарава, Юрыя Зайцава, Аляксандра Кішчанкі, Івана Пушкова, Святланы Катковай ды іншых творцаў.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Дыктоўкі часу

Прымеркаваная да 85-годдзя Беларускага саюза мастакоў выстаўка працуе ў Палацы мастацтва да 26 лістапада. Часовая экспазіцыя мае назву «Старшыня» — свята дало нагоду звярнуцца да творчасці тых майстроў, якія ў свой час узначальвалі мастакоўскі саюз. У экспазіцыі — больш за 130 твораў жывапісу, графікі, скульптуры старшыняў БСМ з калекцыі арганізацыі.

Сярод тых, хто стаяў на чале творчага аб'яднання, большасць — знакамітыя творцы. Нагадаем, гэта Аляксандр Грубэ (1941—1944), Іван Ахрэмчык (1944—1948), Яўген Зайцаў (1948—1950), Андрэй Бембель (1950—1954, 1982—1984), Уладзімір Сухаверхаў (1954—1956), Павел Гаўрыленка (1956—1961), Павел Масленікаў (1961—1962), Віталь Цвірка (1962—1963), Натан Воранаў (1963—1965), Уладзімір Стальмашонак (1965—1968, 1987—1990), Віктар Грамыка (1968—1973, 1977—1982), Віктар Пратасеня (1973—1977), Уладзімір Гардзеенка (1984—1987), Генадзь Буралкін (1990—1998), Уладзімір Басалыга (1998—2007), Уладзімір Савіч (2007—2013), Рыгор Сітніца (2013—2019). З 2019 года Беларускі саюз мастакоў узначальвае Глеб Отчык.

У экспазіцыі прадстаўлена шмат пейзажаў і нацюрмортаў, але галоўная тэма выстаўкі — чалавек, яго месца ў грамадстве і свеце, роля ў гісторыі і ў сучаснасці… «Складаны пасляваенны час, аднаўленне краіны, нацыянальны рамантызм 1980-х гадоў, авангардныя пошукі 1990-х — усё гэта спараджала розную выразную форму і розныя падыходы да рашэння вобраза чалавека», — заўважаюць стваральнікі выстаўкі.

На ўрачыстым адкрыцці ў Палацы мастацтва старшыня творчай арганізацыі Глеб Отчык звярнуўся да мастакоў: «Выстаўка знакавая — гэта той культурны, гістарычны пласт, які сведчыць, што сёння Беларускі саюз мастакоў — не проста творчая супольнасць, а рупар і ідэалогія нашага грамадства. Трэба вельмі ўважліва ставіцца да кожнага твора, бо сёння на нас з вамі вялікая адказнасць за тое, што будзе заўтра».

Уладзімір Гардзеенка «Раніца», 1988 г.



Іван Ахрэмчык. Аўтапартрэт.

А ў гледача пакуль ёсць магчымасць паразважаць, што было ўчора. У экспазіцыі пераважаюць жывапіс, графіка, скульптура, над якімі працавалі ў мінулым стагоддзі. Нават твораў самога Глеба Анатольевіча недазвольна мала. Яго работы з серыі «Мірны час» (2017) адрозніваюцца нетыповай кампазіцыяй, а таксама каларыстычным рашэннем — супрацьпастаўленнем каляровай выявы і быццам выцвілай, як на старой чорна-белай фотакартцы. Гэта погляд сучасніка на мірнае вясковае жыццё, да якога даносіцца водгулле вайны.

Вялізную частку выстаўкі «Старшыні» займаюць маштабныя і камерныя работы Віталя Цвіркі (змясцілі нават яго акварэль). Не меней прадстаўніча выглядае прэзентацыя твораў Паўла Масленікава. Уключылі ў экспазіцыю і значную колькасць разнапланавых карцін Уладзіміра Гардзеенкі. Уважліва паставіліся да спадчыны Уладзіміра Стальмашонка… Ды некаторыя аўтары прадстаўлены даволі сціпла. Зразумела, не на ўсё можна паўплываць — ёсць залежнасць ад таго, колькі ў фондах работ таго ці іншага майстра, наколькі яны адпавядаюць канцэпцыі праекта.

Натуральна, па выстаўцы відаць і прыкметы розных часоў, якія дыктавалі тэмы і погляды на развіццё выяўленчага мастацтва, што дамінавалі ў пэўны перыяд, і эксперыменты тых ці іншых аўтараў — яны, вядома, сустракаліся калегамі і крытыкай або прыязна, або не адразу прымаліся. Хоць надзвычай многае залежала ад пакалення, да якога належыць аўтар. Немагчыма не заўважыць параўнанняў. Напрыклад, прадстаўленыя творы Віктара Пратасені і Рыгора Сітніцы пісаліся прыкладна ў адзін і той жа перыяд (1980-я), аднак іх тэматыка, стылістыка, ідэі выяўляюць прынцыпова розныя кірункі.

Павел Масленікаў «На Палессі», 1980 г.

Віталь Цвірка «Восень. Раўбічы», 1977 г.

Што ні кажы, Віктар Сазонавіч быў прыхільнікам сацрэалізму і маляваў партрэты працаўнікоў, калі быў у даволі сталым узросце, а літаграфіі, прысвечаныя гісторыі і культуры беларусаў, стварэў у той час яшчэ зусім малады мастак Рыгор Сітніца. Процістаяння прынцыпаў і падыходаў выяўленчага мастацтва пазбегнуць, натуральна, немагчыма. Банальны напамін — але менавіта ў спрэчцы нараджаецца ісціна. А пераможцы?.. У рэшце рэшт перамагае заўсёды шчаслівы і ўдзячны глядач.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Майстэрства суцяшэння

Айчыннае мастацтва, прынамсі, жывапіс, не аднойчы папракалі ў залішнім апяванні прыроды. Сапраўды, часам яно здаецца бяздумным, не нясе ў сабе аніякай ідэі ці нават пачуцця. Асабліва гэта відавочна па серыях — у тых выпадках, калі аўтар знайшоў ці скарыстаў пэўнае рашэнне і жадае адлюстраваць тэму, але спрацоўвае гэта толькі ў некалькіх работах; астатняе атрымліваецца другасным, незапамінальным, бляклым. Адзін з нямногіх мастакоў, каму ўдаецца працаваць у традыцыйным жанры і заставацца цікавым гледачу і арт-крытыкам, — жывапісец Антон Вырва. Яго персанальная выстаўка «Свабодная прастора» ў галерэі «Арт-Фабрыка» — нагода для разважанняў.

«Краявіды беларускага мастака Антона Вырвы — рэдкі вялікі скарб вобразаў прыроды, прасякнутых глыбокім пачуццём — любові да навакольнага асяроддзя. Выявы, у якіх пасялілася сапраўдная гісторыя нават у самай простай і штодзённай задуме. Аўтар стварае той сапраўды рэальны пейзаж, у якім вольна «дыхае» кранальнае, простае пачуццё прыроды ў свабоднай прасторы», — так заяўляюць арганізатары пра персанальную выстаўку ў «Арт-Фабрыцы».

Пейзаж як роздум аб прыгажосці і як адлюстраванне адметнасці наваколля, як выяўленне пачуццяў чалавека і як дэманстрацыя вобраза краіны і яе народа — можна па-рознаму падыходзіць да работ Антона Вырвы. Адно дакладна: прырода на яго палотнах шматгранная ў сваёй прыгажосці. Мастак умее перадаць нават самае неспрыяльнае надвор'е так, што глядач зачаруецца. Некалькі дзясяткаў карцін на выстаўцы «Свабодная прастора» — як доказ таго, што такі несучасны жанр, як рэалістычна-лірычны пейзаж, адназначна не губляе папулярнасці. Загадка для многіх хаваецца, мабыць, у жыццесцвярджальнай сіле палотнаў Антона Вырвы. Бывае, чалавеку проста неабходна пачуць заспакаяльнае «Усё будзе добра, усё атрамаецца. Прыйдзе новы дзень, і выгляне сонца. І шлях твой будзе працягвацца…» Мастак дорыць гэтую надзею, веру ў добрае. Многія карціны напоўнены промнямі вясновага святла, чаканай цеплынёй. Матыў абуджэння гучыць упэўнена і гучна і адначасова пранікнёна. Карціны яго не пацерпяць таропкасці, недаверу, няўважлівасці.

«Паводка», 2023 г.

Святло, празрыстасць, далікатнасць работ нагадваюць пра найлепшыя ўзоры рускіх і беларускіх жывапісцаў мінулага стагоддзя — усё ж у сучасным айчынным жывапісе пераважаюць іншыя каларыстычныя рашэнні, адрозная вобразнасць. Гаворка, апроч іншага, пра крыніцы натхнення, магчымыя, хоць часам і відавочныя (творчасць Вітольда Бялыніцкага-Бірулі, Віталя Цвіркі). Пейзажы Антона Вырвы перакананўча беларускія, у іх пазнаюцца наша сціплая прырода, ваколіцы вёсак і гарадоў. На палотнах можна ўбачыць аграгарадкі Іказнь і Ракаў, абласныя цэнтры Віцебск і Гродна, іншыя неназваныя мястэчкі. Аднак мастак не адмаўляецца ад красы далёкіх ад Беларусі мясцін. Вядома, сапраўдны творца не цураецца так званага «чужога».

«Снежань», 2020 г.

Персанальная выстаўка Антона Вырвы ў «Арт-Фабрыцы» безумоўна ўдалая. Усцешылі логіка пабудовы экспазіцыі, падыходы да інтэгравання карцін у выставачную прастору, маштабнасць прадстаўлення творчасці жывапісца. Несумненна, апошнія работы жывапісца, якія раней не дэманстраваліся, заслугоўваюць высокай ацэнкі. Аднак мімаволі нараджаюцца непрыемныя пытанні… А што пасля? Мастак і надалей будзе разважаць аб паэзіі розных станаў прыроды? Працягне прытрымлівацца камернасці і лірызму? Зноў звернецца да ў нечым простых і сціплых матываў? Яго імкненне выявіць адчуванне адзінства з прыродай і родным краем не адыдзе на другі план і не заменіцца чымсьці іншым? Хто ведае… Відавочна ж тое, што майстэрства Антона Вырвы здольна яшчэ неаднойчы захапіць, а створанае — суцешыць.

«Згасае дзень», 2018 г.

Пейзажы выстаўкі «Свабодная прастора» ў галерэі «Арт-Фабрыка» можна ўбачыць да 6 снежня.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Вокамгненне праз уражанне

Мастацкая спадчына жывапісца, педагога, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі Барыса Аракчэева надзвычай багатая, як і ў многіх тагачасных аўтараў. Стваралі шмат — быў і дзяржзаказ, былі розныя нагоды для эксперыментаў, было шмат працы ў стол… Сёння палотны могуць гадамі пыліцца ў сховішчах і бог ведае калі паказацца шырокай публіцы. Гэта калі няма папулярызатараў творчасці таго ці іншага мастака. Аднак здараецца, такія знаходзяцца — як правіла, гэта члены сям'і, якія таксама звязалі сваё жыццё з мастацтвам. Напрыклад, работы бацькі Пятра Шарыпы часта прэзентуе дачка Алена Пятроўна. Папулярызацыяй жа спадчыны Барыса Уладзіміравіча займаецца адна з яго дачок Аксана Барысаўна.

Нядаўна пры яе актыўным удзеле была арганізавана выстаўка «Малая радзіма ў творчасці беларускіх мастакоў» у Мінскай абласной бібліятэцы імя А. С. Пушкіна. Няхай экспазіцыя атрымалася сціплай, як і наогул многія бібліятэчныя, але гэта ўсё адно важная частка справы ўвекавечання памяці мастака, папулярызацыі яго спадчыны. Між тым гэта не проста выстаўка выбраных, далёка не самых знакамітых работ майстра (гуаш, акварэль) — у праект увайшлі творы маладой мастачкі Дар'і Цітовай.

Барыс Аракчэеў «Бярэзіна сухаходная», 1976 г.

Дар'я Цітова нарадзілася ў 1999 годзе ў горадзе Калінкавічы. У 2014—2018 гадах вучылася ў Гомельскім дзяржаўным мастацкім каледжы (спецыяльнасць — «Жывапіс»). У 2022-м скончыла Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы (спецыяльнасць — «Выяўленчае мастацтва і камп'ютарная графіка»). Між тым з 2018 года мастачка працуе настаўніцай выяўленчага мастацтва ў Дудзіцкай дзіцячай школе мастацтваў (Гомельская вобл., Калінкавіцкі р-н, аграгародок Дудзічы). Паспела паўдзельнічаць у некалькіх выстаўках у Беларусі і за мяжой. Сярод іх — Міжнародная выстаўка плакатаў, прысвечаных рэгі, у Ліверпулі (2017) і выстаўка-продаж «Асенні салон» (2022). У 2019-м была арганізавана персанальная выстаўка жывапісу Дар'і Цітовай «Малахітавая шкатулка» ў Калінкавіцкім краязнаўчым музеі. У такой колькасці работы аўтара ў Мінску экспануюцца ўпершыню.

Творы аўтараў пасуюць адзін аднаму. Пяшчотнасць колераў, мяккасць пераходаў, багацце адценняў яднаюць работы, як і выразнасць адлюстраванага, яснасць кампазіцыі. Аднак у Барыса Аракчэева адлюстравана мінулае стагоддзе — пейзажы Яраслаўшчыны і вёскі Турбанава, у якой мастак нарадзіўся і жыў да свайго пераезду ў Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны. У цэнтры ўвагі Дар'і Цітовай — добра знаёмыя ёй мясціны Калінкавіцкага раёна, сучасная Гомельшчына. Некаторым можа падацца: дык і тут нам прапаноўваюць здзейсніць падарожжа ў мінулае. Але ж не. Вулкі, здаецца, паўзанядбанай вёсачкі, маляўнічыя ваколіцы, буянства прыроды — апісанне сучаснай беларускай вёскі, у які куток Беларусі ні завітай. Не заўсёды пазнавальнасць ідзе на карысць твору, але ў дадзеным выпадку яна падаецца да месца. Погляд маладой мастачкі на, здаецца, нічым не адметныя мясціны, яе шчырае замілаванне традыцыйным мастацтвам падкупляе.

Работы Дар'і Цітовай.

— Мне цікава тое, што навокал, — а сельская мясцовасць побач, — адзначае Дар'я Цітова. — Аддаю перавагу гуашы, бо падабаецца яе колеравая насычанасць, цаню яе і за хуткасць выканання. Адсюль і маленькі фармат — хочацца паспець зрабіць болей. Да таго ж і ўражанне ад вокамгнення лепей перадаецца ў малых формах. Вялікія вымагаюць больш карпатлівай працы, прадуманасці, кампазіцыйнай завершанасці… Эцюд у гэтым плане непатрабавальны, але вынік таксама здольны ўразіць.

Выстаўка «Малая радзіма ў творчасці беларускіх мастакоў» у Мінскай абласной бібліятэцы імя А. С. Пушкіна экспануецца да 15 снежня на другім паверсе. Уваход вольны.

Яўгенія ШЫЦЬКА, фота аўтара

Сцэна — для эмоцый,

альбо Тэатральны «Бусел» прылятае раз на два гады

Вечарам 18 лістапада тэатральная грамадскасць збіралася, каб упэўніцца ў тым, што справу сваю робіць нездарма. Вядома, гледачы і зацятыя прыхільнікі тэатраў пра гэта сведчаць праз куплю квіткоў і наведванне спектакляў. Але ж Рэспубліканскі конкурс «Нацыянальная тэатральная прэмія» калісьці прыдумалі дзеля таго, каб з прафесійнага пункту гледжання адзначаць найлепшыя з'явы ў тэатральным жыцці. Таму і пляцоўкі для ўрачыстага ўручэння прэмій выбіраліся знакавыя: у папярэднія гады гэта адбывалася на сцэне і Вялікага тэатра Беларусі, і Купалаўскага. Сёлета ж у сценах гістарычнага будынка па вуліцы Энгельса, 7 у Мінску прайшла фінальная імпрэза конкурсу, які сёлета прайшоў сёмы раз: ён адбываецца раз на два гады, каб было больш новых работ для агляду і аналізу.

Спектаклі з усёй Беларусі, вылучаныя на атрыманне Нацыянальнай тэатральнай прэміі, можна было паглядзець у сталіцы цягам некалькіх тыдняў — такім чынам рэгіянальныя тэатры маюць магчымасць паказаць сябе больш шырока. Журы трэба было паглядзець больш за 30 спектакляў, каб назваць пераможцаў. Зрэшты, гэта заўсёды няпроста. Спачатку наогул у Нацыянальнай тэатральнай прэміі было пашыранае журы. Цяпер падыходы ўжо іншыя, ды і колькасць намінацый мянялася, таму што ёсць спектаклі драматычныя, ёсць лялечныя, ёсць музычныя, а ёсць опера і балет — і ў кожным відзе мастацтва свая спецыфіка, якую трэба ўлічваць.

Між іншым, гледачы, якія ходзяць у тэатр, і самі могуць называць найлепшыя спектаклі. Ім было дастаткова ўбачыць спіс намінаваных пастановак, каб размеркаваць фаварытаў. Бо калі ў спісе опера Уладзіміра Солтана «Дзікае паляванне караля Стаха», то зразумела, што гэта і ёсць тое самае нацыянальнае мастацтва, дзеля падтрымкі якога ў тым ліку задумваўся конкурс. Ці калі бачыш назву «Ідыёт» — спектакль Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага ў пастаноўцы Іваны Жыган з Сербіі, — то зразумела, што такія праекты не здараюцца проста так і будуць адзначаны на высокім узроўні... Але нельга сказаць, што ўсё прадказальна для тэатралаў.

Тэатр мае магутны ўплыў на чалавека менавіта таму, што правакуе жывую эмоцыю. Праўда, ёсць розныя тэатры, з розным узроўнем эмацыянальнасці і рознымі сродкамі яе атрымання. Разважаць пра гэта будуць тыя, хто захоча пасля паглядзець спектаклі, якія сёлета атрымалі ўзнагароды.

«Найлепшым спектаклем для дзяцей і юнацтва» назвалі оперу Вялікага тэатра Беларусі «Гісторыя Кая і Герды» (кампазітар Сяргей Баневіч) у пастаноўцы галоўнага рэжысёра тэатра Ганны Маторнай. Што ж, зразумела: спектакль шыкоўны, дарагі, прыгожы.

Ігар Падлівальчаў атрымаў прэмію за найлепшую мужчынскую ролю.

Але для Ганны Маторнай прыемнасці на гэтым не скончыліся. Таму што найлепшым оперным спектаклем журы назвала «Дзікае паляванне караля Стаха» Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра Беларусі, які яна паставіла, не аднойчы падкрэсліўшы, што не мела права зрабіць нешта менш выдатнае, чым папярэднікі, але з падзякай да стваральнікаў першай пастаноўкі, якая ішла ў тэатры 30 гадоў. І чарговая доля трыумфу — Ганна Маторная атрымала прэмію як найлепшы пастаноўшчык, але ўжо ў секцыі музычнага тэатра. Тут жа адзнака для Юрыя Караваева як найлепшага дырыжора.

Галоўны рэжысёр Вялікага тэатра Ганна Маторная атрымлівае ўзнагароду.

У Вялікі тэатр пайшла ўзнагарода за «Найлепшую жаночую ролю ў музычным спектаклі»: салістка балета Людміла Хітрова атрымала яе за партыю Кітры ў «Дон Кіхоце» (Людвіга Мінкуса), які паставіў Валянцін Елізар'еў. Мастацкі кіраўнік Вялікага тэатра Беларусі быў трыумфатарам прэміі: «Дон Кіхот» прызналі найлепшым балетным спектаклем. Зразумелая радасць харэографа, які здабыў у жыцці столькі розных узнагарод, але дзякуе за тое, што Нацыянальная тэатральная прэмія захавалася, яна больш патрэбна маладым талентам.

Сяргей Кавальчык разам з артыстамі НАДТ імя М. Горкага.

Зрэшты, адзін з іх — харэограф Сяргей Мікель, які ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным музычным тэатры стварыў спектакль «Пад•Свядомасць». Журы яго адзначыла прэміяй у секцыі «Музычны тэатр».

Наогул, прыкмета нашага тэатральнага жыцця на цяперашнім этапе — увага да музыкі, якой усё больш нават у драматычных тэатрах, а часам яна там становіцца вызначальным сродкам. Нездарма «Найлепшы спектакль у жанры аперэты, музычнай камедыі і мюзікла» знайшоўся ў тэатры імя М. Горкага: «Граф Монтэ Крыста», музыку да якога стварыў Цімур Каліноўскі, а пастаноўку ажыццявіў Сяргей Кавальчык. У гэтым спектаклі адзначылі выканаўцу галоўнай ролі акцёра Руслана Чарнецкага (дарэчы, зноў у секцыі «Музычны тэатр»).

Дык а што ж тады «Ідыёт» атрымаў?.. Не, усё ў парадку, узнагароду ў профільнай намінацыі: пастаноўку найлепшага спектакля тэатра драмы здзейсніла Івана Жыган у Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя М. Горкага. У спектаклі сапраўды ёсць на што (на каго) звярнуць увагу.

Але работу акцёраў драматычнага тэатра адзначылі ў іншых пастаноўках. Сярод акцёраў-мужчын — Ігара Падлівальчава (спектакль «Дзядзька Ваня» ў пастаноўцы Аляксандра Яфрэмава Тэатра-студыі кінаакцёра). За найлепшую жаночую ролю ўзнагародзілі Алену Рахмангулаву (спектакль «Валянціна» ў пастаноўцы Валерыя Анісенкі ў Мінскім абласным драматычным тэатры, што месціцца ў Маладзечне). Дарэчы, сваю ўзнагароду за гэты спектакль атрымаў і Валерый Анісенка як найлепшы рэжысёр.

У тэатры шмат што залежыць ад мастацкага афармлення. Дык вось за гэты складнік у драматычных тэатрах адзначылі Лідзію Малашэнка — за работу над спектаклем «Дом Бернарды Альбы», што ідзе ў Новым драматычным тэатры ў Мінску. Але ж і гаспадароў свята чакала свая прэмія ад журы, яе ўручылі народнай артыстцы Беларусі Тамары Міронавай.

Ёсць яшчэ адзін асаблівы від тэатра — лялечны. Але ён таксама бывае розным — з лялькамі ці акцёрамі-людзьмі, якія іграюць не менш драматычна, чым у саміх драматычных тэатрах. На спалучэнні лялек і акцёраў-людзей часам ствараюцца цікавыя небанальныя пастаноўкі. Але і традыцыйныя лялькі не губляюць гледача, асабліва маленькага. Таму не будзем дзівіцца, што журы пастаралася адзначыць розныя лялечныя тэатры ў розных намінацыях. Напрыклад, Віцебскі тэатр «Лялька» — за працу мастака Дзмітрыя Гаралевіча ў спектаклі «Чарамора». Гродзенскі тэатр лялек — за працу рэжысёра Валерыя Карышава ў спектаклі «Гадкае качаня». Была і адмысловая прэмія журы «За творчае асэнсаванне гісторыі роднага краю» ў спектаклі «Магіла льва» Магілёўскага абласнога тэатра лялек. Але што тычыцца акцёрскай работы, то складана было б выбраць найлепшага сёлета апроч Дзмітрыя Чуйкова, калі сярод намінантаў «Запіскі юнага ўрача» ў пастаноўцы Яўгена Карняга. Гэты спектакль Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек, створаны паводле твораў Антона Чэхава, назвалі найлепшым у намінацыі тэатраў лялек. Гэта якраз варыянт небанальнага ў лялечным тэатры.

Наогул, прыкмета нашага тэатральнага жыцця на цяперашнім этапе — увага да музыкі, якой усё больш нават у драматычных тэатрах, а часам яна там становіцца вызначальным сродкам. Нездарма «Найлепшы спектакль у жанры аперэты, музычнай камедыі і мюзікла» знайшоўся ў тэатры імя М. Горкага: «Граф Монтэ Крыста», музыку да якога стварыў Цімур Каліноўскі, а пастаноўку ажыццявіў Сяргей Кавальчык. У гэтым спектаклі адзначылі выканаўцу галоўнай ролі акцёра Руслана Чарнецкага (дарэчы, зноў у секцыі «Музычны тэатр»).

Яшчэ ў межах Нацыянальнай тэатральнай прэміі склалася традыцыя ўручаць спецыяльную ўзнагароду «За ўнёсак у развіццё тэатральнага мастацтва Беларусі». Першы намеснік міністра культуры Валерый Грамада ўручыў яе Адаму Мурзічу, мастацкаму кіраўніку Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра.

Такім чынам, агляд тэатраў за два гады паказаў, што іх у нас шмат, яны існуюць у розных гарадах, пастановачная работа актыўна ідзе, а гледачам ёсць куды хадзіць, каб атрымліваць уражанні і потым выказваць свае меркаванні і спрачацца пра тое, што значыць «найлепшы спектакль» і чаму. А ў тэатрах гэта і так ведаюць. Прэмія — хутчэй стымул рабіць як мае быць. І тады да некаторых прыляціць «бусел» — статуэтка Нацыянальнай прэміі сімвалізуе Беларусь, якая імкнецца да вышынь.

Артысты балета Людміла Хітрова і Антон Краўчанка.

Ларыса ЦІМОШЫК
Фота Лізаветы ГОЛАД

Калі багіня кахання перамагае бога вайны

Пачатак сезона ў Беларускім музычным тэатры праходзіць пад знакам 80-гадовага юбілею яго галоўнага рэжысёра — заслужанага дзеяча мастацтваў Расіі, прафесара Міхаіла Кавальчыка. Адбыўся своеасаблівы парад спектакляў, пастаўленых ім на гэтай сцэне, а яшчэ — прэм'ерныя паказы яго новай пастаноўкі — аперэты Жака Афенбаха «Прыгожая Алена», своеасаблівага бенефіса юбіляра.

Парыс — Яўген Ермакоў і Прыгожая Алена — Маргарыта Александровіч.

Гэтую ідэю Міхаіл Станіслававіч выношваў даўно. Але не заўсёды ў тэатра ёсць усе магчымасці для рэалізацыі той ці іншай творчай задумкі, у прыватнасці наяўнасць у трупе выканаўцаў патрэбнага амплуа. Так, на галоўную мужчынскую ролю падыходзіў толькі адзін саліст тэатра — тэнар Яўген Ермакоў; а ставіць спектакль з разлікам толькі на аднаго выканаўцу рызыкоўна — калі па якой-небудзь прычыне ён не зможа выйсці на сцэну, то і спектакль трэба адмяняць.

Не сакрэт, што ў музычных тэатрах тэнары заўсёды ў дэфіцыце, і каб пераманіць да сябе такога вакаліста з іншага тэатра, яму трэба прапанаваць штосьці вельмі цікавае. А партыя Парыса ў «Прыгожай Алене» і ёсць тая вышыня, якой вызначаюцца выканальніцкія якасці тэнара. Раней у нашым тэатры быў малады вакаліст, здольны выканаць такую партыю. Гэта Шамхал Хачатуран, які ў 2013 годзе закончыў Беларускую акадэмію мастацтваў па спецыяльнасці «акцёр музычнага тэатра». І тут дарэчы будзе нагадаць, што прафесар Міхаіл Кавальчык з'яўляецца кіраўніком курса рэжысёраў і акцёраў музычнага тэатра Беларускай акадэміі мастацтваў і яго вучні рэгулярна папаўняюць трупу як музычнага, так і іншых беларускіх тэатраў. Шамхал Хачатуран адразу ўпэўнена праявіў сябе ў партыях тэнаровага рэпертуару, але ў 2016 годзе ў яго жыццёвай і творчай біяграфіі адбыліся змены — артыст пакінуў не толькі наш тэатр, але і Беларусь. У 2022 годзе, будучы салістам Растоўскага музычнага тэатра, ён атрымаў ад нашага тэатра прапанову, ад якой не змог адмовіцца. «Партыя Парыса для мяне — своеасаблівы творчы выклік і прафесійны рост, — зазначае артыст. — Напрыклад, першая арыя Парыса — самая складаная з усіх аперэтачных, нават некаторыя оперныя арыі бываюць лягчэйшымі. У акцёрскім плане роля Парыса таксама складаная: з аднаго боку ён, несумненна, герой, а з другога — прасцяк, і гэтыя амплуа трэба арганічна сумяшчаць».

Як вядома, менавіта Афенбах лічыцца родапачынальнікам жанру аперэты, але ў Беларускім музычным яго ніколі не ставілі. І нарэшце кіраўніцтва тэатра прыклала намаганні, каб пазнаёміць нашых гледачоў з самым вядомым творам гэтага кампазітара. У часы Афенбаха аперэта яшчэ не выдзелілася ў асобны жанр, падобныя творы тады называлі камічнай операй. А «Прыгожую Алену» кампазітар назваў операй-буф, якая парадзіравала прыёмы і штампы сур'ёзнай оперы. У адпаведнасці з французскай опернай традыцыяй, тут шмат складаных арый, развітых ансамбляў, хароў, разгорнутых музычных фіналаў, і ў той жа час у ёй ёсць уласцівыя аперэце куплеты і размоўныя сцэны.

У аснову сюжэта гэтага твора пакладзены старажытнагрэчаскі міф пра выкраданне траянскім царэвічам Парысам жонкі спартанскага цара — Прыгожай Алены, у выніку чаго пачалася Траянская вайна. Прыкрываючыся антычнай фабулай, кампазітар і яго лібрэтысты Анры Мельяк і Людовік Галеві стварылі не толькі пародыю на сур'ёзную оперу, але і з'едлівую сатыру на сучаснае ім буржуазна-арыстакратычнае грамадства. Так, цар Спарты Менелай быў загрыміраваны пад Напалеона III, а Алена — пад яго жонку Яўгенію. Але французскія рэаліі другой паловы XIX стагоддзя мала цікавілі гледачоў у іншых краінах нават у пачатку XX стагоддзя, не кажучы ўжо пра больш позні перыяд. Існуе некалькі перакладаў арыгінальнага лібрэта на рускую мову, з савецкіх часоў найбольш папулярнай была версія Уладзіміра Канстанцінава і Барыса Рацэра. У пастаноўцы нашага тэатра таксама ўзята за аснову лібрэта гэтых драматургаў. Якім яно было першапачаткова, сёння цяжка сказаць, бо ў кожным тэатры пастаноўшчыкі «падганяюць» дыялогі персанажаў пад канцэпцыю свайго спектакля, прыўносячы ў яго нешта сваё. Таму будзем адштурхоўвацца ад таго, што мы пабачылі.

У адрозненне ад арыгінальнага французскага лібрэта, тут іншы характар палітычнай інтрыгі — яе пляце жрэц храма бога вайны, каб падштурхнуць цара Спарты і яго военачальнікаў да новай вайны. Лічыцца, што ў Старажытнай Грэцыі менавіта спартанцы былі самымі ваяўнічымі, але пры гэтым неадукаванымі і адсталымі ў культурным развіцці. Вось на гэтых супярэчнасцях і будуюцца ўсе камічныя калізіі пастаноўкі. А гісторыя выкрадання Парысам Прыгожай Алены, якая развіваецца на фоне будзённага жыцця спартанцаў, істотна не змяняецца. Змяняецца толькі яе фінал, да якога звернемся пазней.

Спектакль пачынаецца з падзей, якія адбываюцца на храмавай плошчы Спарты. Перад гледачамі паўстаюць абрысы двух храмаў — бога вайны Марса і багіні кахання Венеры, служыцелі якіх сапернічаюць паміж сабой. Адразу ўзнікае пытанне: калі падзеі адбываюцца ў Спарце — адным з полісаў Старажытнай Грэцыі, — то прычым тут старажытнарымскія багі? Старажытная Грэцыя і Старажытны Рым — гэта розныя гістарычныя эпохі і розныя цывілізацыі. Вядома, што рымляне ў многім пераняялі культуру старажытных грэкаў, у прыватнасці іх міфалогію і эпас, але пры гэтым адаптавалі іх пад сябе. Так, у рымскім пантэоне багоў аказалася большасць грэчаскіх, толькі ўжо з іншымі імёнамі. Напрыклад, вярхоўны алімпійскі бог Зеўс — уладар неба, маланкі і грома — у рымскай міфалогіі ператварыўся ў Юпітэра, багіня кахання Афрадыта — у Венеру…

Пры апісанні сюжэта спектакля ў некаторых расійскіх тэатрах сустракаецца то Зеўс, то Юпітэр, або аднаго падмяняюць другім. У нашым жа спектаклі храма вярхоўнага бога няма, але, як ужо адзначалася, ёсць два іншыя храмы: бога вайны і багіні кахання. І галоўным рухавіком інтрыгі з'яўляецца Калхас — жрэц храма Марса, які і сам збяднеў, і храм яго прыйшоў у заняпад. А ўсё таму, што даўно не было вайны і ніхто не прыносіць у храм шчодрыя прынашэнні. Затое храм багіні кахання прадаўжае багацець і квітнець, бо людзі жывуць мірна і кахаюць адно аднаго. Значыць, трэба падбіваць цара Менелая на вайну. А тут і зручны выпадак: у Спарце раптам з'явіўся Парыс, сын траянскага цара, — заклятага ворага Менелая. Праўда, царэвіч, выдаючы сябе за пастуха, чыстасардэчна прызнаўся, дзеля чаго ён прыбыў у Спарту.

Вось тут і гучыць знакамітая арыя Парыса пра конкурс прыгажосці трох багінь і пра тое, каму з іх ён аддаў яблык разладу з надпісам «Самай прыгожай». Багіня Гера, жонка самога Зеўса, абяцала яму вялікую ўладу; багіня вайны Афіна — ваенныя перамогі і славу; а багіня Афрадыта — каханне самай прыгожай жанчыны. Не доўга думаючы, Парыс прысудзіў прыз багіні кахання, якая і падказала яму, што самая прыгожая жанчына — гэта жонка цара Спарты Менелая.

Сцэна са спектакля.

Кемлівы і хітры Калхас адразу сцяміў, што вось ён — шчаслівы выпадак! І пачаў усяляк спрыяць Парысу — нават дапамог яму пранікнуць у пакоі царыцы. А каб стары неразумны цар не блытаўся пад нагамі, знайшоў спосаб адправіць яго на востраў Крыт — нібыта тушыць пажар. А ў гэты час усяляк прыспешваў Парыса выкрасці Алену, пасля чаго абавязкова павінна пачацца вайна. Але ў пэўны момант нешта пайшло не так, як у міфе… Спартанцы нечакана прыйшлі да думкі, што з суседзямі лепш гандляваць, чым ваяваць, і вырашылі пабудаваць храм Гермесу — богу гандлю. А Парыс пад выглядам наваяўленага жраца адвёз Алену не да сябе ў Трою, а на востраў Цытэра, дзе нібыта павінна адбыцца цырымонія асвячэння новага храма багіні кахання. Так што выкраданне ўсё ж адбылося, але без вайны.

Усе гэтыя калізіі ў спектаклі падаюцца ў сатырычна-гратэскнай форме, адпаведна і ўсе персанажы надзелены вострай характарнасцю, а цар Менелай наогул выглядае як парадыйная фігура. У гэтай ролі выступаюць шматвопытныя Віктар Цыркуновіч і Аляксандр Асіпец. Ролю галоўнага інтрыгана — жраца Калхаса — выконваюць вядучыя салісты Антон Заянчкоўскі і Уладзіслаў Даніловіч. У спектаклі ёсць і іншыя цікавыя персанажы, напрыклад, памочнік Калхаса Плутон — спрытны малады хітрун, які вымагае грошы ў свайго гаспадара і гатовы пайсці служыць у храм багіні кахання за яшчэ большую плату. У гэтай ролі цікава выглядаюць характарныя акцёры Сяргей Спруць і Яўген Далідовіч.

На фоне характарных і камічных персанажаў лірычная пара Парыса і Алены выглядае адасоблена. Іх любоўная тэма атрымлівае шырокае развіццё ў меладычна прыгожых арыях, дуэтах, ансамблях. Напрыклад, вельмі рамантычнай выглядае сцэна сна Алены, калі і яна сама, і Парыс робяць выгляд, што іх блізкасць — толькі сон, тым самым нібы апраўдваючы свае дзеянні. Але ў размоўных сцэнах пры ўзаемадзеянні з іншымі персанажамі яны таксама праяўляюць пэўную характарнасць: Алена ў дачыненні да мужа дэманструе прытворства і жаночую хітрасць, а Парыс — дзіўную сумесь прастакаватасці і авантурнасці.

У першы дзень прэм'еры гэтыя ролі выконвалі прыма Маргарыта Александровіч і вядучы саліст Яўген Ермакоў. А ў другі дзень — Шамхал Хачатуран, які мае ўжо больш чым дзесяцігадовы сцэнічны вопыт, і маладая салістка Вольга Цярэнцьева-Чубукова, якая ў мінулым годзе закончыла Акадэмію музыкі і адразу праявіла сябе ў амплуа гераіні.

Гэты спектакль лёгкі для ўспрымання, але цяжкі для пастаноўкі і выканання. У ім трэба спяваць, як у оперы, а іграць — як у тэатры сатыры. Дабіцца такога балансу вельмі няпроста. Таму разам з рэжысёрам неабходна адзначыць дырыжора-пастаноўшчыка Юрыя Галяса, вакальнага кіраўніка Святлану Пятрову, хормайстра Ігара Баканава. Уражвае маштаб работы балетмайстра-пастаноўшчыка Алены Дзмітрыевай-Лаўрыновіч. Гледачоў парадавалі касцюмы персанажаў і сцэнаграфічнае афармленне спектакля, над чым працавалі мастак-пастаноўшчык Андрэй Меранкоў і мастак па касцюмах Ілья Падкапаеў.

Зоя МАТУСЕВІЧ
Фота Сяргея ЧЫГІРА

Сугучча паэтычных вобразаў

У Выдавецкага дома «Звязда» з Кітаем даўнія культурныя сувязі, якія маюць працяг і цікавыя перспектывы. Гэта пацвярджае візіт у рэдакцыю групы кітайскіх студэнтаў, якія вучацца на факультэце журналістыкі БДУ. Нядаўна адбылося адразу некалькі публікацый вершаў кітайцаў-журфакаўцаў на старонках выданняў «Звязды» ў перакладзе на беларускую мову, і гэта стала важкай падставай для сустрэчы. Госці пазнаёміліся са згаданымі публікацыямі сваіх суайчыннікаў, а таксама даведаліся пра беларуска-кітайскія культурныя сувязі. Дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда», старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Карлюкевіч распавёў пра гісторыю беларуска-кітайскіх літаратурных стасункаў, у прыватнасці пра серыю з трынаццаці кніг «Светлыя знакі. Паэты Кітая», якія выйшлі ў Выдавецкім доме «Звязда».

Кітайскія студэнты БДУ ў гасцях у «Звязды».

— Спачатку гэтыя кнігі мы выпускалі толькі на беларускай мове, потым на дзвюх мовах — кітайскай і беларускай. Для гэтага стварылі Міжнародны рэдакцыйны савет. З кітайскага боку ў яго ўвайшоў вядомы перакладчык Гаа Ман, які, на жаль, нядаўна памёр. Ён быў доўгі час галоўным рэдактарам кітайскага часопіса «Сусветная літаратура», які выпускала Акадэмія грамадскіх навук. Гаа Ман у свой час прыязджаў у Беларусь, быў перакладчыкам нашага народнага паэта Максіма Танка, чыя кніга выйшла ў Кітаі ў 1958 годзе. Акрамя таго, у гэтым праекце ўдзельнічалі генеральны дырэктар Кітайскага таварыства літаратурных аўтараў Чжан Хунбо, былы дэкан філалагічнага факультэта другога Пекінскага ўніверсітэта Чжан Хуэйцінь і іншыя вядомыя прадстаўнікі кітайскай навуковай і творчай інтэлігенцыі. У серыі «Светлыя знакі: паэты Кітая» мы прадставілі і паэтычную спадчыну Кітая, і сучасную паэзію. А ў кнізе «Стагоддзе на знаёмства» сабраны найлепшыя пераклады на беларускую мову кітайскай паэзіі. Яшчэ да Першай сусветнай вайны ў газеце «Наша ніва» былі надрукаваны пераклады кітайскіх легенд дзякуючы вядомаму ўсходазнаўцу Васілю Аляксееву. Адзін з класікаў беларускай літаратуры Уладзімір Дубоўка ў 1920-я гады адмыслова вучыў кітайскую мову, каб перакладаць паэзію.

Алесь Мікалаевіч таксама пазнаёміў гасцей са сваімі кнігамі, прысвечанымі літаратурным сувязям Беларусі і Кітая. Маладыя кітайцы даведаліся пра кнігу твораў беларускіх пісьменнікаў, нядаўна выдадзеную ў Кітаі. На пытанне студэнтаў, які кітайскі паэт найбольш яму блізкі, Алесь Карлюкевіч назваў Ай Ціна. Яшчэ ў 1980-х Алесь Мікалаевіч выпадкова набыў зборнік яго вершаў, і ўсё жыццё з ім не расстаецца.

Пісьменніца Людміла Рублеўская, рэдактар аддзела культуры газеты «Звязда», распавяла пра з'яўленне публікацый маладых кітайскіх паэтаў. Пісьменніца чытала курс сусветнай літаратуры для некалькіх груп кітайскіх студэнтаў, якія вучацца на журфаку, і на кожнай лекцыі давала ім творчыя заданні. Студэнты натхняліся вобразамі класічных твораў, якія яны вывучалі, дадавалі да іх вобразы кітайскай культуры, а таксама ўласныя перажыванні і адчуванні… У выніку атрымліваліся цікавыя, прыгожыя і філасофскія творы, што дэманструюць і таленавітасць кітайскіх студэнтаў, якія вучацца ў Беларусі, і асаблівасць іх светаўспрымання. Лепшыя з тых твораў Людміла Рублеўская пераклала на беларускую мову, у выніку атрымалася дзве падборкі ў газеце «Літаратура і мастацтва» і публікацыя на дзвюх мовах, кітайскай і беларускай, у часопісе «Беларусь».

— Мне было цікава не проста даваць інфармацыю, а стварыць творчы дыялог. Вы ўсе ведаюце і любіце класічную кітайскую літаратуру — гэта незвычайнае багацце, скарбніца, адкуль можна бясконца чэрпаць натхненне, — звярнулася да кітайскіх гасцей Людміла Рублеўская. — У вас таксама ёсць унікальная магчымасць дзякуючы навучанню на журфаку БДУ пазнаёміцца з жыццём нашай краіны, з беларускім народам. Мне хацелася, каб беларусы лепей зразумелі кітайцаў, якія сёння вучацца тут, убачылі, якія яны таленавітыя, а кітайскія студэнты занатавалі ў паэтычных вобразах уражанні «беларускага перыяду» свайго жыцця.

Загадчык кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі факультэта журналістыкі БДУ Людміла Саянкова, якая ўдзельнічала ў сустрэчы, адзначыла важнасць ініцыятывы Выдавецкага дома «Звязда» — упершыню кітайскія студэнты, паэты-пачаткоўцы атрымалі магчымасць апублікаваць свае творы ў перакладзе на беларускую мову на старонках літаратурных выданняў.

Людміла Пятроўна прапанавала прысутным студэнтам, сярод якіх, дарэчы, таксама былі паэты-пачаткоўцы, далучыцца да творчага праекта Выдавецкага дома «Звязда», які працягвае беларуска-кітайскія культурныя сувязі на новым узроўні, праз творчыя кантакты з прадстаўнікамі студэнцкай моладзі. Кожны са студэнтаў напіша творчую работу па ўражаннях ад сустрэчы ў рэдакцыі «Звязды», найлепшыя з іх апублікуюцца.

Сустрэча завяршылася паэтычнымі чытаннямі — кітайскія студэнты агучвалі вершы сваіх суайчыннікаў на роднай мове, Людміла Рублеўская зачытвала беларускія пераклады. Сугучча беларускіх і кітайскіх паэтычных вобразаў будзе мець працяг і ў новых сустрэчах, і ў новых публікацыях.

Людміла ІВАНОВА
Фота Лізаветы ГОЛАД

зваротная сувязь

Марафон двух сезонаў

Канал «Культура» Беларускага радыё запрашае слухаць літаратурна-мастацкія і пазнавальныя перадачы.

У выхадныя — праект Навума Гальпяровіча «Сучаснікі. Літаратурныя партрэты». У нядзелю і панядзелак ў радыёверсіі тэлеперадачы «Суразмоўцы» сустрэча з рэктарам Акадэміі мастацтваў Міхаілам Баразной.

У праграме «Літаратурная анталогія» па буднях — аповесць Аляксандра Купрына. У «Радыёбібліятэцы» з панядзелка да пятніцы — «Зялёны лісток на планеце Зямля» Янкі Сіпакова (чытае народная артыстка Беларусі Марыя Захарэвіч). Па суботах выходзіць перадача «Літаратурныя гісторыі» з апавяданнямі айчынных і замежных аўтараў.

У праекце «Прачулым радком» — сумесны праект канала «Культура» і Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы, прысвечаны 110-годдзю выхаду зборніка вершаў «Шляхам жыцця».

Для юных прыхільнікаў мастацкага вяшчання ў межах праекта «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя» — казка Кацярыны Хадасевіч-Лісавой «Новыя прыгоды Лісачкі-красуні». Штовечар у 21.00 «Вячэрняя казка» для самых маленькіх.

Праект «Кнігарня» пазнаёміць з літаратурнымі падзеямі, навінкамі беларускіх выдавецтваў і зместам свежага нумара «ЛіМа».

У праграме магчымы змены. Расклад перадач канала «Культура» даступны на сайце *www.radiokultura.by* і ў сацыяльных сетках.

ЛіМ КАЛЯНДАР

26 лістапада — 105 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Шахаўца (1918—1991), беларускага празаіка, паэта, перакладчыка, заслужанага работніка культуры Рэспублікі Беларусь.

26 лістапада 75-годдзе святкуе Аляксандр Ціткоў (1948), беларускі графік.

27 лістапада — 120 гадоў з дня нараджэння Піліпа Пестрака (1903—1978), беларускага паэта, празаіка, заслужанага дзеяча культуры БССР.

27 лістапада 85-годдзе святкуе Зоя Літвінава (1938), беларуская мастачка манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, жывапісец, графік, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь.

28 лістапада — 95 гадоў з дня нараджэння Анатоля Чаркасава (1928—2000), беларускага празаіка, нарысіста, перакладчыка, крытыка.

29 лістапада — 115 гадоў з дня нараджэння Яўгена Красоўскага (1908—1980), беларускага жывапісца, графіка, заслужанага работніка культуры Рэспублікі Беларусь.

30 лістапада — 95 гадоў з дня нараджэння Галіны Арловай (1928—2021), беларускай актрысы, народнай артысткі Беларусі.

2 снежня — 70 гадоў з дня нараджэння Мікалая Рыжага (1953—2017), беларускага графіка.

Каляндар падрыхтаваны БДАМЛМ

Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі запрашае:

24 лістапада — у публічную бібліятэку № 1 імя Л. М. Талстога на тэатралізаваны лекторый «Ясная паляна» (кіраўнік — Таццяна Жылінская). Пачатак у 17.00.

27 лістапада — у Цэнтральную гарадскую бібліятэку імя Янкі Купалы (вул. В. Харужай, 16) на прэзентацыю чытанкі «Верасок». Пачатак у 10.00.

28 лістапада — у Цэнтральную гарадскую бібліятэку імя Янкі Купалы (вул. В. Харужай, 16) на прэзентацыю кнігі «Валянціна Паліканіна. Пазнаць вялікае ў іншых». Пачатак у 17.00.

29 лістапада — у кабінет пісьменніка пры дзіцячай бібліятэцы № 2 (вул. К. Чорнага, 10) на творчую сустрэчу з Міхасём Пазняковым. Пачатак у 12.00.

29 лістапада — у публічную бібліятэку № 18 (вул. Каліноўскага, 55) на творчую сустрэчу з Уладзімірам Мазго. Пачатак у 12.00.

29 лістапада — у Мінскі гарадскі тэатр паэзіі пры Цэнтральнай бібліятэцы імя Янкі Купалы (вул. В. Харужай, 16) на паэтычна-музычны вечар раманса «Паэзіі і музыкі цудоўнае зліццё». Пачатак у 17.30.

30 лістапада — на фестываль дзіцячай літаратуры ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа. Пачатак у 13.00.

30 лістапада — у літаратурны клуб «Шчырасць» пры публічнай бібліятэцы № 22 (вул. Я. Чачота, 23). Пачатак у 17.00.

Брэсцкае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі запрашае:

30 лістапада — на прэзентацыю калектыўнага зборніка «Строки» ў Баранавіцкую цэнтральную раённую бібліятэку імя Я. Чачота. Пачатак у 11.00.

30 лістапада — у Баранавіцкую цэнтральную гарадскую бібліятэку імя В. Таўлая на «Корнеўскія чытанні».

Выходзіць з 1932 года

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія:
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламедаў
Вольга Дадзіёмава
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 325-85-25
адказны сакратар — 377-99-73
аддзелы крытыкі і бібліяграфіі; прозы і паэзіі ; мастацтва — 317-20-98
бухгалтэрыя — 311-17-16

Выходзіць раз на тыдзень у пятніцу.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Аляксандр Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ
Нумар падпісаны ў друк 23.11.2023 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 658

Друкарня Рэспубліканская ўнітарная прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП1 № 3820000000767 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. Індэкс 220013

Заказ — 2724

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.
Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца ў публікацыях, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

ISSN 0024-4686

9 770024 468001 23047